

ЦІ ЗАПАТРАБАВАНА СЁННЯ АЎТАРСКАЕ КІНО? 9

ЯК СПЫНІЦЬ ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ? 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. СУБОТА № 190 (29057)



Фота БелТА.

# ПАМІЖ ЛЮДЗЬМІ НЯМА ГРАНІЦ

## Першая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Зяленскага прайшла на пазітыўнай і канструктыўнай хвалі

**Візіт Прэзідэнта Беларусі ва ўсходнюю суседку пачаўся са знака пашаны і сяброўства з боку ўкраінскага калегі: Уладзімір Зяленскі вітаў яго ў аэрапорце Жытоміра асабіста, а на перамовы кіраўнікі дзяржаў адправіліся на адным аўтамабілі. Прызнаннем даверу і пашаны сталі і самі перагаворы: толькі ў вузкім складзе яны доўжыліся больш за дзве з паловай гадзіны.**

«Усё, аб чым мы дамовімся, будзе выконвацца. Хачу запэўніць, што мы свята будзем выконваць нашы дамоўленасці», — сказаў беларускі лідар у пачатку перагавораў. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Зяленскаму ад імя ўсёй беларускай дэлегацыі — у Жытомір на II Форум рэгіёнаў Беларусі і Украіны прыехала амаль паўтысячы чалавек. «На блізкую нам, можна сказаць, родную, зямлю. І вы вельмі тонка заўважылі, правільна, што ў нас, нягледзячы на тую граніцу, якую нас і прымусілі выбудаваць, паміж людзьмі няма ніякіх граніц, кардонаў. Мы сапраўды разумеем адны адных. Хоць і размаўляем на розных мовах, яны блізкія і зразумелыя нашым людзям», — выказаў упэўненасць кіраўнік Беларусі. Што датычыцца знаёмства з украінскім калегам, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў: знаёмы вельмі даўно. Праўда, завочна.

«Сёння мы сустракаемся тут сам-насам для таго, каб яшчэ раз зверыць гадзіннікі, прайсціся па парадку дня нашых адносін і дамовіцца», — падкрэсліў беларускі лідар, дадаўшы, што гісторыя дала шанц выканаць дамоўленасці на карысць народаў. Ён адзначыў, што для Беларусі ёсць не толькі прагматычная аснова ўзаемадзеяння з украінскай дзяржавай і народам Украіны. «Гэтая глыбокая вялікая ідэалогія заснавана на гісторыі, якую мы з вамі перажылі. Ды і цяпер нам няпроста. Усе праблемы, якія ёсць у нас і ў вас, мы перажываем разам. Хачу вас запэўніць: вы ніколі не мелі праблем з тэрыторыі Беларусі і з Беларуссю, і вы ніколі не будзеце іх мець. Мы заўсёды будзем самыя добрыя і надзейныя вашы прыхільнікі, партнёры. І калі новая ўлада Украіны захоча мець з намі братэрскія цесныя адносіны, за намі затрымкі не будзе», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу, Уладзімір Зяленскі заявіў, што Беларусь і Украіна сапраўды не маюць межаў.

«Я перш за ўсё гавару пра людзей», — сказаў украінскі лідар. Дарэчы, ён пачаў перагаворы па-беларуску: «Добры дзень, сябры!» Ва ўступным слове перайшоў з рускай на ўкраінскую мову, адзначыўшы, што нават так кіраўнікі дзяржаў разумеюць адзін аднаго.

«Нашы людзі дружныя, ментальна абсалютна блізкія. І я ганаруся, што ў нас такія добрыя адносіны і суседзі», — падкрэсліў Прэзідэнт Украіны.

### МЕЖЫ — ТОЛЬКІ НА КАРТАХ

Перагаворы працягнуліся ў пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый — менавіта тут Аляксандр Лукашэнка заявіў, што граніца Беларусі з Украінай не павінна быць перашкодай для перамяшчэння людзей. На перагаворах Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць у паспяховым мірным урэгуляванні канфлікту ў Данбасе — як і ў нармалізацыі становішча на ўсходзе Украіны. «Я не проста вам жадаю гэтага. Мы гатовы разам што-небудзь зрабіць для таго, каб Украіна была адзінай, цэласнай, магутнай, каб скоса нават ніхто не змог сюды паглядзець. Гэта нашы прынцыпы», — падкрэсліў беларускі лідар.

СТАР. 2

# ВЫСОКІ СТАТУС НАСТАЎНІКА

***Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь***

***Дарагія сябры!***

*Сардэчна віншую вас з Днём настаўніка.*

*Ваша вялікая праца патрабуе поўнай самааддачы, высакароднасці душы, цярпення і бязмежнай любові да дзяцей.*

*Мы жывём у дынамічны час: развіваецца навука, удасканальваюцца методыкі, абнаўляецца змест адукацыі. Аднак нават самыя сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ніколі не заменяць жывых стасункаў з настаўнікам.*

*Абапіраючыся на традыцыі і духоўныя каштоўнасці народа, вы вызначаеце заўтрашні дзень краіны. Ведзяце сваіх вучняў да вяршынь ведаў, фарміруеце асобы, выхоўваеце сапраўдных патрыётаў — грамадзян нашай Айчыны.*

*Перакананы, што аўтарытэт і высокі статус настаўніка ў грамадстве — залог паспяховай будучыні дзяржавы.*

*Дзякую вам за высокі прафесіяналізм, вернасць абавязку і прызванню.*

*Жадаю моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым сем'ям.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



**Алена ІЛЬЮШКІНА з хорам вучняў пачатковых класаў «Кропелька».**

Сярэдняя школа № 37 — найлепшая навучальная ўстанова Цэнтральнага раёна Мінска. Але не толькі з гэтай нагоды я прыйшоў сюды, каб зрабіць фота да Дня настаўніка, а яшчэ і таму, што ў дружным педагагічным калектыве школы працуе настаўніца музыкі і спеваў Алена ІЛЬЮШКІНА, працоўны педагагічны стаж якой — роўна пяцьдзясят гадоў! Менавіта столькі Алена Цімафееўна працуе на адным месцы: у яе працоўнай кніжцы толькі адзін запіс.

— Пасля музычнага вучылішча з дыпломам педагога сальфеджыа, дырыжора хора і настаўніка спеваў я прыйшла менавіта ў гэтую школу, бо калісьці тут вучыўся мой будучы спадарожнік па жыцці — муж. Ён і прывёў мяне сюды, — з усмешкай прыгадвае Алена Цімафееўна. — Паверце, ніколі не хацела мяняць сваю работу і свой калектыў!

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Майстар-клас

# Ці не заржавелі педагагічныя інструменты?

## Чаму больш не працуе метад бізуна і перніка



**Што рабіць настаўніку, якога не слухаюць вучні? Як быць, калі педагог крычыць на дзіця? Што такое аўтарытэт настаўніка? Ці мэтазгодна ўводзіць пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці тэст на прафесійную прыдатнасць? На гэтыя і многія іншыя важныя тэмы разважаў у Мінску заснавальнік гуманна-асобаснага падыходу ў выхаванні і адукацыі, акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі, педагог-наватар, чыя спадчына вывучаецца на ўніверсітэтах многіх краін свету, Шалва АМАНАШВІЛІ. Славуты стваральнік канцэпцыі гуманнай педагогікі наведаў Беларусь, каб абмеркаваць разам з настаўнікамі і бацькоўскай грамадскасцю актуальныя праблемы сучаснай школьнай адукацыі і выхавання. Шалву Аманашвілі называюць настаўнікам ад Бога. Яго галоўная педагагічная ідэя — прыняцце любога вучня такім, які ён ёсць. Ён упэўнены, што нельга падзяляць дзяцей на добрых і дрэнных, на разумных і неразумных. На першае месца Аманашвілі заклікае ставіць выхаванне і сцвярджае, што дабрыня памнажаецца дабрынёй, шчырасць — шчырасцю, радасць — радасцю. «Нам патрэбныя людзі, для якіх дыктатура сумлення стаіць вышэй за ўсё, — кажа ён. — Дзяцей трэба выхоўваць на найлепшых шэдэўрах чалавечнасці». А вось школьную аднаку Шалва Аманашвілі параўноўвае з вінтоўкай, нацэленай у лоб дзіцяці. Мы сабралі самыя цікавыя тэзісы зоркі педагогікі, якія прагучалі на сустрэчы ў Мінску.**

СТАР. 4

КОРАТКА

- Мабільны сэрвіс БРСМ «Галасую!» пачаў працаваць у тэставым рэжыме.
- **Беларускія прадпрыемствы на выстаўцы IEMA дамовіліся пра пастаўкі тэхнікі ў Пакістан.**

ISSN 1990 - 763X

19190>

9 771990 763008

# ПАМІЖ ЛЮДЗЬМІ НЯМА ГРАНІЦ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнты краін абмеркавалі таксама супрацоўніцтва ў нафтаперапрацоўцы і пастаўках нафты, стварэнне па прапанове Аляксандра Лукашэнкі сумесных прадпрыемстваў і супрацоўніцтва ў ракетабудаванні. У прыватнасці, разам рэалізаваць апошні праект можна хутчэй (за паўтара-два гады) і за меншыя грошы.

Беларускі ж бок гатовы інвеставаць і стварыць сумесныя прадпрыемствы ва Украіне па грамадзянскім кірунку — аўтамабілі, трактары, аўтатэхніка вялікай грузападымальнасці, іншая тэхніка.

Аднаўленне суднаходства па Дняпры і развіццё партовай гаспадаркі таксама абмяркоўваліся на сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў.

«Гэта нам будзе выгадна», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

## АД ЛАГІСТЫКІ ДА КІНАФІЛЬМА

Учора ж прэзідэнты ўзялі ўдзел у пленарным пасяджэнні II Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны. Падчас пасяджэння Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь гатова ўважліва вывучыць прапановы Украіны па актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва

Украіна — адзін з галоўных гандлёвых партнёраў Беларусі. Толькі летась таваразварот павялічыўся амаль на дваццаць працэнтаў.

«Але гэта далёка не мяжа нашых магчымасцяў», — пераканаены Прэзідэнт Беларусі. Сярод прыярытэтаў, на ягоную думку, — гандлёва-энергетычны і аграпрамысловы комплексы, прамысловая кааперацыя, транспартна-лагістычная сфера.

Аляксандр Лукашэнка гатовы да таго, што сяброўства Беларусі і Украіны будзе адчуваць націск і з Захаду, і з Усходу. Але прэзідэнты гатовыя гэты бар'ер пераадолець.

«Мы добрыя людзі. Не хочам супраць кагосьці сябраваць, супраць кагосьці ваяваць. Мы павінны быць моцныя», — падвёў вынік беларускі лідар.

Сёлета ў Беларусі пачалі трансляцыю ўкраінскія тэлеканалы, і цалкам імаверна, што ва Украіне хутка будзе гаварыць і паказваць Мінск. Прынамсі, ідэю запуску беларускага тэлеканала ў паўднёвай суседцы яе кіраўнік падтрымаў.

А пачнуць, магчыма, з сумесных здымак кінастужкі — на перагаворах прэзідэнты закранулі і пытанні культуры.

«Сваты» хацелі зняць. Хваля пачалася — «Сваты» не знялі. Ну, беларускія «Сваты» здымем. Мы гатовы даць усе ўмовы. Яны ў нас выдатныя. У вас вопыт каласальны — тое, чаго ў нас няма. Давайце разам стварыць гэтыя фільмы, каб нашы народы бачылі, што мы родныя, нікуды не разбегліся і бегчы не збіраемся», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Больш за тое, ён згадзіўся, што дзяржавы маглі б разам пазмагацца за права правесці міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы высокага ўзроўню: Прэзідэнт Украіны прапанаваў замахнуцца на Алімпійскія гульні.

* * *

На вуліцы і ў будынку, дзе адбыўся II Форум рэгіёнаў, прэзідэнтаў загадзя чакалі дзясяткі журналістаў — кіраўнікам дзяржаў давялося літаральна прабірацца скрозь шчыльныя рады карэспандэнтаў, адначасова адказваючы на шматлікія пытанні. Цікавіліся і ўнутранымі пытаннямі, і міжнароднай праблематыкай. А хтосьці проста прасіў зрабіць сумеснае сэлфі на смартфон.

Што ж, здымкі павінны атрымацца гістарычныя, бо, як упэўнены беларускі лідар, першая сустрэча і асабістае знаёмства стануць вялікім крокам да ўмацавання і развіцця даўніх адносін паміж дзяржавамі.

# Энергетыка плюс экалогія



**XXIV Беларускі энергетычны і экалагічны форум пройдзе ў Мінску з 8 да 11 кастрычніка.**

Гэтае мерапрыемства ўключае ў сябе міжнародныя спецыялізаваныя выстаўкі «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра» (EnergyExpo), Oil&Gas Technologies, «АтамЭкспа-Беларусь», «Экспасвет», «Водныя і паветраныя тэхналогіі», «Экспагорад» і XXIV Беларускі энергетычны і экалагічны кангрэс. На форуме ўдзельнікі прадставяць сучаснае абсталяванне і тэхналогіі для вытворчасці і размеркавання электрычнай і цеплавой энергіі, аўтаматызаваныя сістэмы, энерга- і рэсурсазберагальныя тэхналогіі.

Сам форум пройдзе на пляцоўцы Футбольнага манежа ў Мінску, паведаміла **намеснік міністра энергетыкі Вольга ПРУДНІКАВА.** Яна адзначыла, што для падрыхтоўкі форуму быў створаны аргкамітэт, які рыхтаваў тэматычныя мерапрыемствы. Гэта шэраг міжнародных канферэнцый, семінараў, круглых сталоў і экспазіцыя, на якой будзе прадстаўлена больш за 600 кампаній з 16 краін свету (Аўстрыя, Азербайджан, Беларусь, Германія, Данія, Італія, Кітай, Літва, Польшча, Расія, ЗША і іншыя).

Намеснік міністра звярнула ўвагу, што ў падрыхтоўцы форуму, акрамя Мінэнерга, актыўна ўдзельнічалі Мінпрыроды, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарту.

Мінэнерга правядзе мерапрыемствы з нямецкім энергетычным агенцтвам DENA. «Адно з новых для нас пытанняў — выкарыстанне ў энергетычных мэтах цвёрдых камунальных адходаў. Будзем таксама ўзаемадзейнічаць па пытаннях лічбавізацыі электраэнергетычнай галіны і рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця», — дадала Вольга Пруднікава.

Акрамя таго, як удакладніў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХМЕЛЬ,** на форуме пакажуць новыя тэхналогіі для аховы навакольнага асяроддзя, а прадстаўнікі Мінпрыроды возьмуць удзел у многіх тэматычных мерапрыемствах.

«Сёння энергетыка і экалогія ўзаемазвязаны. Падчас форуму мы будзем шмат казаць пра Мэты ўстойлівага развіцця, непасрэдна Мінпрыроды адказвае за рэалізацыю сямі з сямнаццаці гэтых мэт, у тым ліку скарачэнне выкідаў шкодных рэчываў у атмасферу, ахову і рацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў, — адзначыў намеснік міністра. — Думаю, што Беларускі энергетычны і экалагічны форум надасць імпульс развіццю тэхналогій, накіраваных менавіта на ахову навакольнага асяроддзя».

У структуры экспазіцыі прадугледжаны галіновыя раздзелы Мінэнергетыкі, Мінпрамсловасці і Мінпрыроды. На выставачнай экспазіцыі будуць прадстаўлены калектыўныя стэнды з розных рэгіёнаў Расіі, у ліку якіх Башкартастан, Чувашыя, Яраслаўская, Смаленская і Цюменская вобласці, Маскоўская гандлёва-прамысловая палата.

Акрамя таго, на выстаўцы «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра», якая пройдзе падчас форуму, будзе паказана больш за 140 навукова-тэхнічных распрацовак, паведаміў **начальнік упраўлення навукова-тэхнічнай палітыкі і экспертызы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Фёдар ХАДОРКІН.**

Тут варта адзначыць, што каля 70 % з іх было рэалізавана па дзяржаўных навукова-тэхнічных праграмах і праграмах навуковых даследаванняў. Прычым калі ў гэтай пяцігодцы было каля 30 дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм, то на наступны пяцігадовы перыяд з 2021 да 2025 года іх ужо заяўлена больш за 38.

«Дзяржаўная палітыка, якая праводзіцца ў Беларусі ў дачыненні да стымулявання навукова-тэхнічнай дзейнасці, выклікае цікавасць рэальных распрацоўшчыкаў. Дзяржава фінансуе гэтыя распрацоўкі, прычым дае бюджэтнае фінансаванне не менш чым на 50 %. Сёння сфарміраваны досыць прывабныя для даследчыкаў і навукоўцаў умовы для навукова-тэхнічнай творчасці, рэалізацыі ідэй», — сказаў прадстаўнік камітэта.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Улады Польшчы сцвярджаюць, што праз тры гады краіна адмовіцца ад расійскага газу

Урад Польшчы запэўніў, што пасля 2022 года рэспубліка зможа цалкам адмовіцца ад расійскага газу. З адпаведным сцвярджэннем выступіў у эфіры Польскага радыё прадстаўнік урада краіны па пытаннях стратэгічнай энергетычнай інфраструктуры Пётр Наімскі.

«Цяпер мы ўсё яшчэ атрымліваем самую вялікую, ільвіную долю газу з Расіі. Гэта доўгатэрміновы кантракт, ад якога мы адмовімся да канца 2022 года», — сказаў ён.

«Цяпер частку імпарту мы атрымліваем і праз газапорт у Свінауйсьці. Гэтым шляхам мы атрымліваем каля 3 млрд кубаметраў газу ў год. Гэта — доўгатэрміновыя кантракты з Катарам, але ўжо пачаліся і пастаўкі з ЗША», — адзначыў Наімскі, нагадаўшы таксама аб будаўніцтве Baltic Pipe — газаправода, які злучыць Польшчу праз Данію з нарвежскім шэльфам.

«І гэты газаправод, і пашыраны тэрмінал у Свінауйсьці — гэта наш стратэгічны выхад з залежнага ад рускіх становішча. Пасля 2022 года праблема будзе вырашана. Увесь імпарт газу ў Польшчу будзе ажыццяўляцца з іншага напрамку», — дадаў прадстаўнік польскага ўрада.

Польшча спажывае больш за 15 млрд кубаметраў газу ў год. Трэць гэтага аб'ёму яна здабывае самастойна на сваёй тэрыторыі, а астатняе імпартуе. Галоўны пастаўшчык газу ў Польшчу — «Газпрам».

### Курц атрымае мандат на фарміраванне новага ўрада Аўстрыі 7 кастрычніка



Прэзідэнт Аўстрыі Аляксандр Ван дэр Белен 7 кастрычніка даручыць лідару кансерватыўнай Аўстрыйскай народнай партыі Себасцьяну Курцу сфарміраваць новы ўрад краіны па выніках датэрміновых выбараў у Нацыянальны савет (ніжняя палата парламента). Пра гэта паведаміла адміністрацыя прэзідэнта Аўстрыі.

«Прэзідэнт прыме ў сябе ў панядзелак, 7 кастрычніка 2019 года, старшыню АНП Себасцьяна Курца. Пасля гэтай гутаркі прэзідэнт надзеліць Себасцьяна Курца мандатам на фарміраванне ўрада», — гаворыцца ў заяве прэс-службы канцылярыі прэзідэнта.

У чацвер МУС Аўстрыі паведаміла, што па выніках падліку ўсіх галасоў на парламенцкіх выбарах 29 верасня кансерватыўная АНП перамагла з 37,5 % галасоў (71 дэпутацкі мандат). Сацыял-дэмакратычная партыя Аўстрыі (СДПА) займае другое месца з 21,2 % галасоў (40 мандатаў). На трэцім месцы ідзе правая Аўстрыйская партыя свабоды (АПС) з 16,2 % галасоў (31 мандат).

### Астанкі Гандзі скралі з мемарыяла ў Індыі ў дзень яго 150-годдзя

Невядомыя выкралі астанкі індыйскага дзяржаўнага дзеяча і філосафа Махатмы Гандзі, якія захоўваліся ў мемарыяле, размешчаным у цэнтральнай частцы Індыі, паведамляе часопіс India Today са спасылкай на мясцовыя ўлады.

Лідар індыйскага нацыянальна-вызваленчага руху быў забіты ў студзені 1948 года. Яго астанкі былі крэміраваны, а прах падзелены на некалькі частак, адна з якіх захоўвалася ў мемарыяле ў штаце Мадх'я-Прадэш.

Аб страце праху стала вядома ў дзень святкавання 150-годдзя Гандзі, 2 кастрычніка. Крадзеж заўважыў кіраўнік мясцовага савета.

Акрамя таго, вандалы напісалі на сцяне з вывяай Гандзі словы «здраднік нацыі».

Па факце здарэння распачата расследаванне.

Махандас Карамчанд Гандзі — ідэолаг нацыянальна-вызваленчага руху Індыі і прыхільнік філасофіі негвалтоўнай барацьбы, якую ён прапаведаваў у ходзе шматгадовай барацьбы індыйцаў за вызваленне ад брытанскага каланіяльнага панавання.

Гандзі быў забіты нацыяналістам-радыкалам Натхурамам Годзе, незадаволеным яго палітыкай. Годзе быў асуджаны да смерці і пакараны ў 1949 годзе.

## Блізкая ўлада

# У ФОРМЕ ДЫЯЛОГУ

**Супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з 8 кастрычніка да 1 лістапада правядуць шэраг выязных прыёмаў грамадзян і юрыдычных асоб у рэгіёнах. Прадстаўнікі Адміністрацыі вывучаць на месцах выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы і эфектыўнасць дзеянняў мясцовых органаў улады па павышэнні ўзроўню жыццезабеспячэння насельніцтва. Асаблівую ўвагу звернуць на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў, выяўленне праблем, якія выклікаюць занепакоенасць людзей і патрабуюць апаратыўнага вырашэння.**

График работы на наступны тыдзень выглядае так: **8 кастрычніка ў 11.00** пачне прыём грамадзян у Мастоўскім райвыканкаме **Іван ЛАЎРЫНОВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці. 9 кастрычніка з 9 гадзін** раніцу ў Бялыніцкім райвыканкаме будзе працаваць **Міхаіл РУСЫ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці. У чацвер, 10 кастрычніка, з 10.00** прыём грамадзян у Крупскім райвыканкаме правядзе **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ,** а ў Докшыцкім райвыканкаме ў гэты ж час — **Анатоль ЛІНЕВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці. 11 кастрычніка з 11 гадзін** у Пінскім гарвыканкаме грамадзяне змогуць трапіць на прыём да **Анатоля МАРКЕВІЧА, памочніка Прэзідэнта — інспектара па Брэсцкай вобласці.** У Брагінскім райвыканкаме ў гэты ж дзень будзе працаваць са зваротамі жыхароў **Юрый ШУЛЕЙКА, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці.**

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# МОЛАДЗЬ, ЯКАЯ ВЫБРАЛА РАБОТУ Ў АПК,

## сабралася на форум, што прайшоў у Рагачоўскім раёне на Гомельшчыне

**Спецыялісты, якія абралі сельскую гаспадарку справай свайго жыцця, скарысталіся магчымасцю і задалі пытанні кіраўніку вобласці Генадзю САЛАЎЮ.**

Ідэя правядзення форума належыць Прэзідэнту Беларусі. Папулярызацыя сельскагаспадарчай працы і сельскага ладу жыцця — не адзіная мэта такой сустрэчы. Размова ішла і пра стварэнне ўмоў для павышэння сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці сельскай моладзі, пра формы супрацоўніцтва органаў улады, адукацыйных устаноў, камерцыйных і грамадскіх арганізацый у рабоце па сацыяльным развіцці сяла, пра фарміраванне кадравага рэзерву аграпрамысловага комплексу...

— Дзяржава многа робіць, каб падтрымаць замацавальнасць кадраў. Сёння наша агульная задача ў тым, каб стварыць для сельскай моладзі камфортныя ўмовы жыцця і працы на вёсцы, — адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — І толькі разам з маладымі людзьмі можна стварыць іх, выпрацаваўшы стратэгію развіцця. Пры гэтым важна зацікаўліваць моладзь з самага ранняга ўзросту, паказваць на прыкладах бацькоў і прафесіяналаў сваёй справы іх значнасць. Рэсурсы для развіцця галіны ёсць: дакладнае земляробства, GPS-навігацыя — прагрэсіўныя тэхналогіі, якія даступныя і ўжо ўжываюцца ў Беларусі.





Фота БелТА.

**У Гомельскай вобласці пражывае каля 1,5 мільёна чалавек, з іх ва ўзросце ад 14 да 31 гады — звыш 270 тысяч, ці пятая частка ўсяго насельніцтва. Штогод у народна-гаспадарчы комплекс рэгіёна ўліваецца амаль паўтары тысячы маладых спецыялістаў.**

Сустрэча з моладдзю праходзіла ў вёсцы будучыні — аграгарадку Ціхінічы. Гэты населены пункт — адзін з 25 самых перспектыўных у Гомельскай вобласці. Вытворчасць і развітая сацыяльная інфраструктура населенага пункта даюць магчымасці для стварэння новых рабочых месцаў.

Дыялог адбыўся ў рэжыме адкрытага мікрафона. Маладых работнікаў прадпрыемстваў АПК цікавілі стаўленне губернатара да здаровага ладу жыцця, сацыяльных сетак і інфармацыйнай прасторы, ступень даверу маладым кіраўнікам, забеспячэнне жыллём, прафесійны рост маладога жыхара вёскі і тыя задачы, якія сёння ставіць перад сельскай моладдзю дзяржава.

**Старшыня Беларускага прафесійнага саюза аграпрамысловага комплексу Мікалай ЛАБУШАЎ** падкрэсліў, што ў апошнія гады замацавальнасць маладых спецыялістаў на вёсцы складае больш за 50 %. Каб усе 100 % заставаліся ў галіне, трэба яшчэ многа зрабіць:

— Зямля не прабачае памылак, ляноты і бездаказнасці. Вялікая роля адводзіцца асабістым якасцям як кіраўнікоў, так і спецыялістаў. Пры гэтым не выключаецца значэнне работы ў камандзе. Важна не замоўчваць праблемы, якія ўзнікаюць, а вырашаць іх, не саромецца спытаць у калег, перадаваць свой досвед і прыслухоўвацца да іншых, прытрымлівацца тэхналогій. Толькі так можна рухацца наперад, — пералічыў ён.

Сёлета на сельгаспрадпрыемствы Гомельшчыны прыбыло каля 800 выпускнікоў галіновых ВНУ і сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў. Каля 100 маладых спецыялістаў АПК прыняла ўдзел у І Форуме сельскай моладзі. Яны наведалі сельскагаспадарчую вопытную станцыю НАН Беларусі ў аграгарадку Доўск, машынна-трактарны парк ААТ «Ціхінічы», экамузей «Беларуская лялька», азнаёміліся з дзейнасцю ААТ «Рагачоўскі МКК», залажылі яблыневую алею. Пяці маладым сем'ям, дзе абодва сужэнцы працуюць у прадпрыемствах АПК, уручылі падарункі ад Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Класныя навіны

# Колькі мужчын сярод настаўнікаў-філолагаў?

**Амаль 94 працэнты ўсіх настаўнікаў, што працуюць у школе, маюць вышэйшую адукацыю. Як вынікае са статыстычнага агляду, падрыхтаванага да Дня настаўніка, гэта прафесія носіць у Беларусі ярка выражаны жаночы характар.Так, сярод настаўнікаў і кіраўнікоў школ жанчын 86,4 працэнта.**

У агульнай колькасці педагогаў, якія выкладаюць у школе асобныя прадметы, прадстаўнікі моцнага полу на пачатак 2018/2019 навучальнага года складалі 18,2 працэнта. У топ-5 прадметаў, дзе колькасць настаўнікаў-мужчын была самая высокая, увайшлі «фізічная культура» (63,7 працэнта ад агульнай колькасці), «дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» (60,7 працэнта), «працоўнае навучанне» (43 працэнты), «фізіка» (35,5 працэнта) і «гісторыя і грамадазнаўства» (28,9 працэнта).

А вось сярод настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры мужчын-педагогаў амаль няма (усяго 2,5 і 2 працэнты адпаведна). Сярод настаўнікаў замежнай мовы іх толькі 5 працэнтаў, біялогіі — 8 працэнтаў, хіміі — 9 працэнтаў.

Больш за 15 гадоў працуюць па спецыяльнасці 67,9 працэнта настаўнікаў і кіраўнікоў беларускіх школ. А першую і вышэйшую кваліфікацыйныя катэгорыі з іх маюць каля 80 працэнтаў.

Усяго на пачатак 2018/2019 навучальнага года ў краіне функцыянавалі 3035 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, з іх 1421 — у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, 1614 — у сельскай мясцовасці. Адукацыю ў іх атрымлівалі 1010,4 тысячы вучняў, з якімі працавалі 112,5 тысячы настаўнікаў, з іх у гарадах і пасёлках — 77,6 тысячы, у сельскай мясцовасці — 34,9 тысячы. У выніку на кожнага педагога ў гарадскіх школах прыпадала 11 вучняў, а ў сельскіх — толькі пяць.

78,2 працэнта ўсіх настаўнікаў — гэта настаўнікі-прадметнікі. Па сваім колькасным складзе сярод іх лідзіруюць настаўнікі замежнай мовы (13 328 чалавек). За імі ідуць настаўнікі матэматыкі (7220), беларускай мовы і літаратуры (6728), рускай мовы і літаратуры (6680). Даволі шмат і фізрукоў (6322). А вось самыя рэдкія ў школе настаўнікі дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі — іх усяго 466 чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Варта ведаць

## 50 ДАДАТКОВЫХ ЦЯГНІКОЎ НА ЛІСТАПАДАЎСКІЯ СВЯТЫ

**З 1 да 10 лістапада БЧ уводзіць дадатковыя цягнікі і павялічвае перыядычнасць курсіравання цягнікоў у міжнародных і міжрэгіянальных зносінах.**

Як паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, у міжрэгіянальных зносінах будуць курсіраваць 42 дадатковыя цягнікі. Іх увядзенне і павелічэнне перыядычнасці прадугледжана на традыцыйна папулярных у пасажыраў напрамках: Мінск — Гомель, Мінск — Брэст, Мінск — Віцебск, Мінск — Магілёў, Мінск — Пінск, Магілёў — Гомель, Полацк — Мінск.

У міжнародных зносінах дадаткова ўведзены цягнікі па найбольш запатрабаваных маршрутах: Мінск — Вільнюс — Мінск, Гомель — Сноўск — Гомель, Мінск — Львоў — Мінск.

Работа па ўвядзенні дадатковых цягнікоў на міжрэгіянальных і міжнародных напрамках працягваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


### Результаты рекламной игры «Авто от Мастеркард. Август»

**Организатор рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.
**Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Август».**
Срок проведения рекламной игры: в период с 1 августа по 28 сентября 2019 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).
Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.
Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3604 от 19.07.2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 19 июля 2019 г.
В рекламной игре приняло участие 126 703 физических лица.
Призовой фонд разыгран полностью.
Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Август»

Главный приз № 1 – Автомобиль HYUNDAI ACCENT (HCr), № кузова Z94K241BALR174996 и денежные средства для уплаты налога в размере 3 861,00 (три тысячи восемьсот шестьдесят один) белорусский рубль 00 копеек

| № п/п | № Шанса | Номер карты | ФИО победителя | Населенный пункт |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 125 651 | 70833700950015932870010 | Лукьянчук Сергей Николаевич | Пинск |

**Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, Velcom – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно**


## Улоў на 15 тысяч рублёў

**Трох браканьераў з Вілейкі затрымалі з буйным уловам на мясцовым вадасховішчы.**

Яны вылавілі сеткамі 176 кілаграмаў рыбы. У момант затрымання два «здабытчыкі» знаходзіліся з лодкай на беразе. Улоў яны паспелі загрузіць у машыну свайго таварыша. Кіроўца, у багажніку якога інспектары выявілі дзевяць мяхоў з сеткамі і рыбай, адмаўляцца не стаў і расказаў, хто перадаў яму незаконны ўлоў. Усіх траіх змясцілі пад варту, а аўто — пад арышт.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, ва ўлове браканьераў аказаліся дзясяткі асобін адборнага судака (64 штукі) і ляшча (61 штука), а таксама 12 асобін драбнейшай рыбы. Прычыненая прыродзе шкода ацэнена амаль у 15 тысяч рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Гучная справа

# НЕ ЎСЁ ЯШЧЭ ЯСНА...

**Пасля правядзення неабходных следчых дзеянняў святар з пасёлка Азарычы Калінкавіцкага раёна, які быў затрыманы па падазрэнні ў забойстве сваёй жонкі, выпушчаны з ізалятара часовага ўтрымання.**




Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» **ва ўпраўленні Следчага камітэта па Гомельскай вобласці,** учора раніцай начальнік упраўлення СК па Гомельскай вобласці генерал-маёр юстыцыі Сяргей Паско правёў выязную аператыўную нараду з членамі следчай групы, якія расследуюць забойства ў Азарычах, і кіраўніцтвам райвыканкама. На нарадзе былі абмеркаваны новыя факты ў расследаванні крымінальнай справы. Таксама Сяргей Паско паведаміў, што следства будзе інфармаваць грамадскасць пра ўсе этапы расследавання рэзанаснай справы.

Учора жанчыну пахавалі на яе радзіме ў Столінскім раёне. Сяргей Паско папрасіў грамадскасць і СМІ праявіць спачуванне да чалавечай трагедыі, не нагнятаць абстаноўку і не распаўсюджваць здагадкі пра абставіны забойства.

Як паведамлялася, 42-гадовую жанчыну, якая вяла бухгалтэрыю і адказвала за царкоўную краму, без прыкмет жыцця і з пашкоджаннямі на целе знайшлі 2 кастрычніка ў прыватным доме ў гарадскім пасёлку Азарычы. Па падазрэнні ў злачынстве затрымалі яе 47-гадовага мужа, настаяцеля мясцовага храма святых апосталаў Пятра і Паўла. Калінкавіцкі раённы аддзел Следчага камітэта распачаў крымінальную справу па частцы 1 артыкула 139 Крымінальнага кодэкса (забойства).

Следчыя сумесна з супрацоўнікамі міліцыі дэталёва правяраюць усю інфармацыю, якая можа мець дачыненне да злачынства. 3 кастрычніка па падазрэнні ў забойстве жанчыны затрыманы 23-гадовы жыхар адной з вёсак Калінкавіцкага раёна. Ён дапамагаў святару ў рамонце храма і бываў у яго дома. Правяраецца яго магчымае дачыненне да здзяйснення злачынства.

Работа па высвятленні абставін забойства працягваецца. Для гэтага прыцягнуты найлепшыя следчыя раённага і абласнога падраздзяленняў, работнікі крыміналістычнага аддзела УСК, а таксама супрацоўнікі крымінальнага вышуку.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# Ці не заржавелі педагагічныя інструменты?

## Дзеці з фіялетавай аўрай

— Мяне ўпрыгожваюць дзве васьмёркі (мэтру педагогікі цяпер 88 гадоў. — **Аўт.**). А калі іх павярнуць, атрымаецца вечнасць, — жартуе ён. — У далёкім 1963 годзе, калі мы з маёй жонкай пачалі ствараць сваю сям'ю, ніякай гуманнай педагогікай мы не валодалі, а проста былі неблагімі людзьмі, з добрым выхаваннем і адукацыяй. І сына выхоўвалі па-добраму, як самі гэта разумелі і адчувалі на той момант. Потым нарадзілася дачка. Прайшло шмат гадоў, і з'явіліся ўнукі, а цяпер ужо і праўнукі. І ў нас назапасіўся вялікі вопыт, які мы называем гуманным падыходам да выхавання.

**«Пачатковая школа не дае дзецям шырату мыслення, уменне аналізаваць, абагульняць, мець уласную думку».**

Сучасныя дзеці дастаўляюць шмат пакут і для бацькоў, і для школы... Але чаму так адбываецца? Прыблізна з сярэдзіны 1990-х гадоў у свет сталі прыходзіць дзеці з фіялетавай аўрай — іх называюць «дзеці індыга». Гэта зусім іншыя дзеці, у іх вельмі шмат таленавітасці, прычым шматгранных. Маім пакаленнем можна было лёгка кіраваць і маніпуляваць, чым паспяхова займаліся і сям'я, і школа. Але з дзецьмі індыга такія падыходы не спрацоўваюць. У іх шмат свавольства, непакорлівасці, пакрыўджанасці, яны адчуваюць перавагу над намі, перавагу над сваімі настаўнікамі (не свядома, а інтуітыўна). Яны прыйшлі ў наш свет адразу з ведамі. Гэта іншае пакаленне, якое пераўзыходзіць нас. А мы па-ранейшаму спрабуем іх выхоўваць метадам бізуна і перніка. Ніяк не можам адмовіцца ад аўтарытарнай педагогікі. Сілавы падыход да дзяцей, на жаль, — норма для традыцыйнага адукацыйнага працэсу. Калі ў педагогаў узнікаюць складанасці ў стасунках з вучнем, яны называюць яго гіперактыўным. «Калі ласка, бацькі, прыміце меры, ваша дзіця не падпарадкоўваецца волі настаўніка...» А што такое актыўнасць? Ці можна ўвогуле вымераць яе ўзровень? Няма такога тэрмометра. Можна вымераць тэмпературу паветра або тэмпературу цела. Калі 36,6 — гэта норма, а калі вышэй ці ніжэй — то не. А якім прыборам будзем вымяраць дзіцячую актыўнасць? І ў кожнага настаўніка будзе свая «норма»...

У мяне часта пытаюцца: «Як паводзіць сябе з гіперактыўнымі?» Гэта цікавіць і бацькоў, і педагогаў. Вось вам рэцэпт: у сям'і бацька павінен быць больш гіперактыўны, чым дзіця. А калі ён прыходзіць дадому, павячэраў і потым перамясціўся на канапу адпачыць, то навошта ўвогуле такі бацька? Для яго дзіця заўсёды будзе цяжкое ў выхаванні. А вось калі тата — рамантык, для якога не існуе ніякіх межаў, то з яго прыходам жыццё абавязкова зменіцца. І дзеці будуць яго чакаць: «Тата прыйшоў!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Маладое віно ў старых мяхах

А які настаўнік скардзіцца на гіперактыўных дзяцей? Толькі гіперпасіўны. Педагог павінен быць творчым, вынаходлівым наватарам, тады і скаргаў на гіперактыўнасць не будзе, не будзе рознагалоссяў у класе. Дзеці бязмежныя ў сваіх здольнасцях, таму кожнаму патрэбен свой урок. Яны хочуць свабоды, а свабода — гэта выбар, што вучыць і як вучыць. Таму на адным уроку павінна быць столькі нарыхтовак, колькі ў класе дзяцей, — як матрошка ў матрошцы. Настаўнік павінен рыхтаваць вялікую матрошку да кожнага ўрока.

Малым гіперактыўнасць патрэбная для рэалізацыі і ўвасаблення той місіі, якую яны нясуць у сябе. Без прызначэння ніхто наогул не нараджаецца, але хтосьці яго знаходзіць, а хтосьці — не. Калі чалавек не знаходзіць свой шлях, гэта бяда, ён заўсёды будзе ўсім незадаволены: жыццём, сваім акружэннем, надвор'ем, заробкам... Усё таму, што стаіць не на сваёй, а на чужой сцяжынцы. Прыслухайцеся да сваіх дзяцей.

### Даведка:

*Шалва Аманашвілі — грузінскі, савецкі, расійскі педагог-наватар. Доктар псіхалагічных навук, акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі, прафесар. Уладальнік шматлікіх званняў і ўзнагарод, у тым ліку «Рыцар дзяцінства», «Настаўнік Вялікай Расіі», лаўрэат прэміі ўрада Расійскай Федэрацыі. Аўтар больш чым 20 кніг, многія з якіх сталі класікай выхаваўча-педагагічнай літаратуры.*

*Заснаваў больш за 200 цэнтраў і лабараторый гуманнай педагогікі ў Расіі, Украіне, Беларусі, Кіргізіі, Казахстане, Латвіі, Літве, Эстоніі. З'яўляецца навуковым кіраўніком шэрагу эксперыментальных школ.*

Тое, што яны кажуць, можа гучаць дзіўна. «Маё дзіця — фантазёр», — кажуць бацькі. А яно не фантазіруе, а праўду кажа, толькі яго праўда не ўкладваецца ў свядомасць дарослых.

«Сіндром дэфіцыту ўвагі» — для мяне гэта не дыягназ, які патрабуе карэкцыі. Ён часта гучыць у бок дзяцей, чые патэнцыйныя магчымасці не задзейнічаны, ім не хочацца знаходзіцца на ўроку, бо там сумна.

Пакаленне індыга пакуль яшчэ прырастае. Калі гэта скончыцца — праз пяць ці праз дзесяць гадоў — планета сама вырашыць. Дзеці — іншыя, але педагогі не хочуць гэтага зразумець. Ці можна ў старых мяхах утрымліваць новае віно, маладое, якое кіпіць? Канешне, немагчыма: мяхі будуць разарваныя, і віно выльецца вонкі. Патрэбныя новыя мяхі. Вы жадаеце, каб дзеці перавысілі вашы чаканні, сталі лепшыя за вас, але педагагічныя інструменты для дасягнення мэты заржавелі. Трэба шукаць новыя...

Калі настаўнікі не змяняюць сваё стаўленне да дзяцей і будуць «зацыкленыя» толькі на навучанні, то бяды не пазбегнуць. Пакуль у школе пануе аўтарытарызм, будуць і канфлікты, што мы паўсюдна і назіраем. Дзіця ператвараецца ў агрэсара, і педагог становіцца агрэсарам. Новае пакаленне не пацерпіць аўтарытарызму ні ў сям'і, ні ў школе. Трэба гэта, нарэшце, зразумець. Калі настаўнік больш любіць уладу над вучнямі, чым іх саміх, школьнікі рэагуюць адпаведна — бунтам!

### БУДЗЬ У КУРСЕ!

Тэрмін «дзеці індыга» ўвялі ў абарачэнне эзатэрыкі. Вывучаючы аўры розных людзей, яны са здзіўленнем выявілі ўсё часцейшае з'яўленне дзяцей з аўрай цёмна-фіялетавага колеру, колеру індыга. Па гэтай адметнай прыкмеце і былі названыя незвычайныя дзеці новага часу. Яны неардынарна праяўляюць сябе ў вонкавым свеце і маюць зусім непадобную на папярэднія пакаленні сістэму каштоўнасцяў. Прыходзяць у гэты свет з адчуваннем сваёй значнасці, адчуваюць, што «заслужылі быць тут». У іх няма абсалютных аўтарытэтаў, яны не лічаць патрэбным тлумачыць свае ўчынкі і прызнаюць толькі свабоду выбару. Яны ўсё пра ўсё ведаюць і патрабуюць ад навакольных, каб з імі размаўлялі як з дарослымі людзьмі. Іх немагчыма напалохаць або прымусіць што-небудзь зрабіць, з імі можна толькі дамовіцца.

## Дамалюйце дзіця!

Аднойчы Шалва Аманашвілі атрымаў ліст ад маладой настаўніцы, якая маліла дапамагчы: падказаць, як зрабіць так, каб дзеці не перашкаджалі ёй на ўроку. (З падобным пытаннем да яго звярнуліся і ў Мінску: «Як наладзіць кантакт з класам, калі цябе не слухаюць?» — **Аўт.**)

— Я задумаўся і напісаў ёй: «У вас, напэўна, здаровая псіхіка. Таму можаце ўзяць даведку, пайсці у магазін па продажы зброі, купіць там вінтоўку і навесці яе на дзіця. І паглядзіце, ці будзе яно вас слухацца», — усміхаецца Шалва Аманашвілі. — Ёсць паняцце — настаўнік ад Бога. Калі б такога педагога не было ў маім жыцці, то і я не стаяў бы цяпер на гэтай сцэне. Яна прыйшла і выратавала мяне.

**«Пакуль у школе пануе аўтарытарызм, будуць і канфлікты».**

Да шостага класа Шалва быў двоечнікам, замест урокаў катаўся па Тбілісі на трамваі.

— Бацькі няма, ён загінуў на фронце, маці дапамагчы мне не можа, педагогам было на мяне напляваць. І тут прыходзіць у школу настаўніца, якая стане маім асабістым духоўным выхавальнікам, — расказвае Шалва Аманашвілі. — Яна кліча мяне да сябе і кажа: «Хлопчык, дай мне паглядзець у твае вочы». І доўга так вывучае, у мяне ўжо мурашкі па целе пачынаюць бегаць, бо я не разумею, што адбываецца. А потым яна пытаецца: «Ты вершы пішаш?» «Не пішу», — шчыра адказваю я. «А ў цябе такі паэтычны погляд», — кажа яна. Сабрала вучнёўскія сшыткі і выйшла з класа. А я стаю ашаломлены. У мяне, аказваецца, паэтычны погляд! Нічога падобнага мне раней не казалі, ніводнага добрага слова... І вось іду я па вуліцах Тбілісі, дзе гуляюць паэты 40-х гадоў, ганаруся, бо ў мяне ж таксама паэтычны погляд! Гляджу раз-пораз у люстэрка... І, нарэшце, вырашыў сесці за вершы. Цяпер мне за іх сорамна, але тады я прыйшоў з імі да настаўніцы. А яна кажа: «Якая рыфма! Адкуль такі вобраз да цябе прыйшоў?» Гэты педагагічны метад называецца дамалёўваннем. Мяне дамалявалі, наклалі пэўную фарбу. Але як высока ўзнялася мая самаацэнка! Школу скончыў ужо з залатым медалём. А пазней і вершы ў мяне атрымаліся...

Звычайна настаўнікі ідуць да вучняў са сваім прадметам у руках. А трэба разам з вучнямі ісці да прадмета. Развіццё — гэта не атрыманне ведаў, а адкрыццё тых здольнасцяў, з дапамогай якіх мы атрымліваем веды. Не бывае неталенавітых дзяцей — бывае толькі абмежаваная педагогіка. Школа — гэта лесвіца для ўзыходжання дзіцяці. Толькі ад настаўніка залежыць, ці зможа самарэалізавацца пакаленне індыга.

Педагог на ўроку можа «памыліцца», а вучні яго папраўляюць і тым самым узвышаюцца. Але настаўнік не прызнаецца, што памыліўся знарок, што гэта і ёсць яго методыка. Ён, як добры акцёр, іграе сваю ролю, а дзеці нічога не заўважаюць.

Сучасныя адукацыйныя стандарты распрацоўваюцца на ўзроўні сярэдняга настаўніка. Мы быццам вядзём сваіх вучняў на могілкі: вось тут «пахаваная» фізіка, а тут — геаметрыя. Дзеці вывучаюць мёртвыя веды: 90 працэнтаў таго, што мы ім сёння даём, заўтра ўжо проста не спатрэбіцца.

Не забывайцеся: мы маем справу з бязмежна таленавітым пакаленнем дзяцей. Упэўнены, што яны павінны прыўнесці ў свет штосьці вельмі важнае, інакш навошта так шмат адоранасці? І наша задача — дапамагчы ім рэалізаваць свае здольнасці, а не пахаваць іх у дзяцінстве. Чаму часта выдатнікі, якія пераходзяць у сярэднюю школу, становяцца там сераднячкамі? А таму, што пачатковая школа не дае дзецям шырату мыслення, уменне аналізаваць, абагульняць, мець уласную думку...

## Вашы шэдэўры

Выхаванне — такі феномен, пра які ў кожнага ёсць сваё меркаванне. Можна спыніць людзей на вуліцы і пытацца: «Маё дзіця сваволіць, не слухаецца, урокі рабіць не хоча, як быць?» І любы чалавек палічыць магчымым даць вам параду. Ніводны не скажа: «Я не педагог».

У выхаванні ніхто не ведае, у каго ісціна, бо адны і тыя ж метады могуць спрацаваць у дачыненні да аднаго дзіцяці і аказацца абсалютна бессэнсоўнымі ў дачыненні да іншага. Выхаванне — гэта вельмі тонкае мастацтва, духоўнае сілкаванне стрыжня дзіцяці. Вакол нас вельмі шмат хлусні. З тэлевізара льецца магутны паток хлусні. А мы памылковыя думкі нясём дзецям як ісціну.

**«Сілавы падыход да дзяцей, на жаль, — норма для традыцыйнага адукацыйнага працэсу».**

Чым больш ты караеш дзіця, тым горш, тым больш моцнае будзе супраціўленне. Калі дзіця падрасце, гадоў у трынаццаць яно цалкам выйдзе з-пад вашага кантролю. Дзіцяці трэба дарыць ласку, любоў, спагаду і дараванне...

Успрымайце дзіця як з'яву ў вашым жыцці. І стаўцеся да яго адпаведна, у першую чаргу без раздражнення, таму што калі маці ці бацька раздражняюцца, не ідзе гаворка ні пра якое выхаванне, а толькі пра разбурэнне ўжо створанага. А калі выхаванне правалілася, пачынаецца перавыхаванне, што яшчэ горш.

Памятайце, што дзіця нараджаецца не дзеля таго, каб працягнуць ваш шлях ці рэалізаваць вашы амбіцыі. Нельга навязваць яму прафесію, густы, ацэнкі. Трэба даць яму магчымасць прайсці свой шлях, пражыць сваё жыццё і выканаць сваю місію. Не выхоўвайце дзіця для сябе, яно не ваша ўласнасць. Выхоўвайце яго для свету. Свет чакае вашых шэдэўраў!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# ПАДАРУНАК ДА СВЯТА

## Напярэдадні Дня настаўніка найлепшыя педагогі з усёй краіны наведалі Палац Незалежнасці

**Настаўніцай хіміі ў гімназіі № 2 горада Бабруйска Алена ВЯНГЛІНСКАЯ працуе ўжо 17 гадоў. У 2002-м залатая медалістка, выпускніца гэтай установы адукацыі вярнулася ў родную гімназію ў якасці выкладчыцы. У школьныя часы яна перамагала ў абласных алімпіядах, а сёння ўжо яе вучні заваёўваюць званне найлепшых не толькі ў краіне, але і за яе межамі. На лацкане яшчэ маладога педагога ўжо блішчыць медаль — «Выдатнік адукацыі». Як і знак пашаны, ззяюць вочы Алены Уладзіміраўны, і адразу верыш, што ад сваёй работы яна атрымлівае асалоду. На думку настаўніцы, сакрэт «хіміі» адносін паміж вучнямі і выкладчыкамі просты — пачуццё меры, добразычлівасць і шчырая зацікаўленасць. Пазнаёміліся карэспандэнты «Звязды» з Аленай Вянглінскай у Палацы Незалежнасці. Яе і яшчэ амаль 60 калег (найлепшых з усёй Беларусі) напярэдадні прафесійнага свята запрасілі на экскурсію ў самы прыгожы адміністрацыйны комплекс краіны.**







Пачалася экскурсія з самай вялікай часткі палаца — залы ўрачыстых цырымоній. Там адбываюцца маштабныя святочныя падзеі з удзелам вялікай колькасці гасцей. Зала ўпрыгожана манументальнымі пано, карцінамі, фотаработамі і скульптурамі найлепшых майстроў Беларусі.

Усяго ў комплексе 20 залаў выконваюць прадстаўніцкія функцыі. Госці наведалі большую частку з іх. Асабліва цікавай была «зялёная» зала, дзе адбываліся перагаворы нармандскай чацвёркі. Многія з настаўнікаў хацелі пасядзець за сталом перагавораў, за якім падзеі ва Украіне абмяркоўвалі лідары Расіі, Германіі, Францыі і Украіны.

Падобная на «зялёную», «камінная» зала, па словах экскурсавода, — самая любімая ў Прэзідэнта. Менавіта там адбываецца большасць сустрэч у вузкім фармаце: 200—250 у год. Асаблівая частка памяшкання — электрычны камін, але ўключаюць яго ўсяго некалькі разоў у год па жаданні высокіх гасцей.

Маштабам уразіла настаўнікаў вялікая зала прыёмаў, якая задзейнічана падчас важных свят. Там ушаноўваюць абаронцаў Айчыны, ладзяць сустрэчы да Міжнароднага дня жанчын.

Не маглі абысціся без фота госці і ў «чырвонай» зале. Яна асаблівая з многіх прычын. Тут адбываюцца толькі рабочыя нарады з кіраўніцтвам краіны, і да таго ж у 2017-м з навагоднім віншаваннем да беларусаў Прэзідэнт звяртаўся з гэтай залы.

Наведалі настаўнікі і адну з любімых (па словах экскурсавода) залаў Уладзіміра Пуціна — «Слуцкую». Сваю назву яна атрымала ад арнаменту на сценах, які ўвасобіў у сабе матывы малюнкаў на слуцкіх паясах.

Некаторыя з удзельнікаў экскурсіі зайшлі ў знаёмае месца ў палацы — залу ўручэння дзяржаўных узнагарод, дзе яны атрымлівалі свае знакі пашаны з рук Прэзідэнта.

Зацікавіла прысутных і экспазіцыя фота з прыватнага архіва Прэзідэнта. На ёй можна ўбачыць здымкі Аляксандра Лукашэнкі ў дзіцячыя, студэнцкія і армейскія гады.





Асабліва ўражанне зрабіў на гасцей зімовы сад. Пад купалам палаца ў стаўку плаваюць рыбкі, чарапахі і б'е фантан. Ну і, вядома, дзівосныя, унікальныя рэчы змешчаны у Музеі падарункаў.

Скончылася экскурсія для настаўнікаў у прывычным для многіх журналістаў месцы — прэс-цэнтры. І калі для нас гэта звыклае месца працы, то для гасцей Палаца Незалежнасці яно, як і іншыя, было надзвычай цікавае.

Пасля экскурсіі наша новая знаёмая Алена Вянглінская адзначыла, што адміністрацыйны комплекс уразіў яе сваімі маштабам, дызайнам. Але асаблівы гонар за тое, што ўсё зроблена рукамі айчынных майстроў. Падтрымала яе думкі і **выкладчык рускай мовы і літаратуры Ірына САЎКІНА** з гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны горада Мінска: «Уражвае. Грандыёзнае месца. Рада, што ў нашай краіне ёсць такі прыгожы комплекс. Асобна адзначу, што ўсе работы, якія мы бачылі, зроблены нашымі таленавітымі майстрамі».

Настаўнікі з радасцю падзякавалі за такі цікавы і пазнавальны падарунак да іх свята. Але ўсё ж такі прызналіся, што найбольш чаканы і дарагі падарунак — словы ўдзячнасці ад іх вучняў.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ЯБЛЫКІ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

**Падрыхтавалі вучні 8 «А» класа сярэдняй школы № 144 Мінска ў якасці сімвалічнага падарунка да прафесійнага свята педагогаў. З кошычкамі сакавітай садавіны трое вучняў сустракалі на ўваходзе настаўнікаў і кожнаму ўручалі чырванабокі, перавязаны стужкай яблык.**



Астатнія школьнікі класа віншавалі педагогаў на іншых паверхах. Іх «святочная служба» скончылася ў восем раніцы, а Руслана Краўцова, Уладзіслаў Жданько і Кірыл Меляняка дзяжурылі на пасту, пакуль у школу не прыйшлі ўсе настаўнікі. Уручыць яблык, усмешку і добры настрой было іх учорашнім абавязкам.

Чаму служба і абавязак? Проста 8 «А» на гэтым тыдні дзяжурны па школе: усе вучэбныя дні яны адказныя за сталоўку, урокі і, вядома, святкаванне. У панядзелак вахту пяройме іншы клас.

— Мы ўжо віталі настаўнікаў кветкамі, цукеркамі, дробнымі падарункамі. Цяпер вырашылі: паколькі зараз восень, будзе добра пачаставаць прыгожымі яблыкамі, — кажа Руслана.

Прыйшлі актывісты-выдатнікі, як кажа пра вучняў іх **класны кіраўнік Людміла КАЗАЧОНАК,** — яшчэ васьмі не было. А яблыкі ўпрыгожвалі стужкамі дома ў хлопцаў.

— Мама, канешне, дапамагала, — прызнаецца Кірыл, а на маё правакацыйнае пытанне «колькі сам з'еў?» адказвае, што ў яго на яблыкі алергія, так што ніводнага.

Ва ўсіх настаўнікаў, якія спяшаліся на работу як у звычайны дзень, пасля ўручэння яблыкаў спачатку на твары лёгкая разгубленасць, затым — шчырая ўсмешка і падзяка.

— Малайцы, здзівілі, прыемны падарунак, — смяецца **педагог-арганізатар Васіль ГАЛАВЕШКА,** які толькі што атрымаў свой яблык. — Мне ўдвая гэта прыемней, бо звычайна я адказны за нешта падобнае.

— Мне дзеці насамрэч заўжды ўсміхаюцца. Мы заўсёды знаходзім агульную мову, а сёння дык тым больш, — дзеліцца ўражаннямі **Васіль ЗЕЛЯНОЎ, настаўнік інфарматыкі,** які жартуе з дзяжурнымі святкавальшчыкамі і падбадзёрвае іх на пачэсным пасту.

— Некаторыя ад нечаканасці нават увесь кошык намагаліся схапіць, — смяюцца школьнікі. Яны толькі што высвятлялі праз гульню «камень-нажніцы-папера», хто будзе ўручаць яблык галоўнаму педагогу школы — дырэктару.

Школе, дарэчы, сёлета спаўняецца 40 гадоў. З датай святкавання яшчэ не вызначыліся, аднак цёплая сямейная атмасфера тут заўжды, кажа дырэктар, якая толькі ўвайшла ў дзверы і атрымала свой яблык.

— У нас традыцыі ўсе прыемныя. Школа наша невялікая, і я ведаю кожнага асабіста. Ужо шмат гадоў мы не проста вучымся тут, а жывём у ёй. Аднак такі сюрпрыз нечаканы, — прызнаецца задаволеная **Жанна ЛАЗАРЧЫК, дырэктар школы.** — Мы планавалі свята ў выходны дзень, а сёння настройваліся на звычайную рабочую пятніцу.

Што ж, стварыць настаўніку з ранку добры настрой — пэўна, і ёсць самы лепшы падарунак.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота аўтара.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «12 поводов для улыбки»

Настоящие правила проведения рекламной игры «12 поводов для улыбки» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «12 поводов для улыбки» (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об организаторе.**
Общество с ограниченной ответственностью «Триовист» (далее – Организатор).
УНП 190806803.
Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190806803 решением Минского горисполкома от 22 февраля 2007 года № 339.
Местонахождение Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.
Почтовый адрес Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, 220020, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.
Адрес электронной почты: **info@21vek.by.**

**2. Наименование рекламной игры.**
«12 поводов для улыбки».

**3. Территория проведения Рекламной игры.**
Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения Рекламной игры.**
Срок начала Рекламной игры: 8 октября 2019 года;
Срок окончания Рекламной игры: 9 декабря 2019 года (включая период розыгрыша и выдачу призов, опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**
Организатором создана Комиссия по проведению Рекламной игры (далее – Комиссия) в следующем составе:
Председатель Комиссии: Писаревский Александр Валентинович, директор по маркетингу ООО «Триовист».
Члены Комиссии:
1. Дехтяр Алина Вадимовна, ведущий юрисконсульт ООО «Триовист»;
2. Калита Юлия Александровна, юрисконсульт ООО «Триовист»;
3. Зарожная Эльвира Гасановна, руководитель подразделения по закупкам косметики и бытовой химии ООО «Триовист»;
4. Гречко Александр Анатольевич, заместитель управляющего по информационным технологиям ООО «Триовист»;
5. Порошин Алексей Валерьевич, управляющий ООО «Сандэйз точка бай».

**6. Перечень продукции, участвующей в Рекламной игре.**
Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж товаров ТМ Colgate и ТМ Palmolive (далее – Игровые товары), реализуемых в интернет-магазине www.21vek.by с условием обязательной покупки как минимум одного Игрового товара.

ПЕРЕЧЕНЬ ИГРОВЫХ ТОВАРОВ

| | | |
|---|---|---|
| 1 | 5670629 | Зубная паста Colgate Безопасное отбеливание природный уголь (75 мл) |
| 2 | 652598 | Зубная паста Colgate Тройное действие. Натуральная мята (150 мл) |
| 3 | 891289 | Зубная паста Colgate Древние секреты. Укрепление эмали (75 мл) |
| 4 | 652602 | Зубная паста Colgate Древние секреты. Безопасное отбеливание (75 мл) |
| 5 | 652603 | Зубная паста Colgate Древние секреты. Безупречная свежесть (75 мл) |
| 6 | 641051 | Зубная паста Colgate Древние секреты забота о деснах (75 мл) |
| 7 | 671317 | Зубная паста Colgate Макс Фреш с освежающими кристаллами (100 мл) |
| 8 | 671315 | Зубная паста Colgate Макс Фреш с освежающими кристаллами. Взрывная мята (100 мл) |
| 9 | 652605 | Зубная паста Colgate МаксБлеск с отбеливающими пластинками (100 мл) |
| 10 | 652608 | Зубная паста Colgate Total 12 Pro. Видимый эффект (75 мл) |
| 11 | 798310 | Зубная паста Colgate Total 12 Pro. Здоровое дыхание (75 мл) |
| 12 | 671324 | Зубная паста Colgate Total 12 Pro-Gum Health (75 мл) |
| 13 | 798273 | Зубная паста Colgate Total 12. Профессиональная чистка (75 мл) |
| 14 | 671319 | Зубная паста Colgate Профессиональная отбеливающая (75 мл) |
| 15 | 641054 | Зубная паста Colgate Total 12 Professional Clean в форме геля (75 мл) |
| 16 | 652607 | Зубная паста Colgate Total 12. Чистая мята (75 мл) |
| 17 | 653078 | Зубная паста Colgate Безопасное отбеливание (75 мл) |
| 18 | 641075 | Зубная паста Colgate Безопасное отбеливание забота о деснах (75 мл) |
| 19 | 652606 | Зубная паста Colgate Total 12. Чистая мята (125 мл) |
| 20 | 671320 | Зубная паста Colgate Optic White (75 мл) |
| 21 | 652609 | Зубная паста Colgate Optic White Мгновенный (75 мл) |
| 22 | 671322 | Зубная паста Colgate Sensitive Pro-Relief (75 мл) |
| 23 | 798570 | Зубная щетка Colgate 360 Суперчистота всей полости рта |
| 24 | 641061 | Зубная щетка Colgate 360 Суперчистота всей полости рта (1 шт. +1 шт.) |
| 25 | 671333 | Зубная щетка Colgate 360 Optic White |
| 26 | 652619 | Зубная щетка Colgate 360 золотая с древесным углем |
| 27 | 652618 | Зубная щетка Colgate 360 с древесным углем |
| 28 | 671326 | Зубная щетка Colgate Сенсация свежести Twister Fresh |
| 29 | 652615 | Зубная щетка Colgate ЗигЗаг 2 + 1 |
| 30 | 641056 | Зубная щетка Colgate Эксперт чистоты (3 шт. + 1 шт.) |
| 31 | 671329 | Зубная щетка Colgate Массажер |
| 32 | 799077 | Зубная щетка Colgate Массажер (1 шт. + 1 шт.) |
| 33 | 671331 | Зубная щетка Colgate Древние секреты. Безопасное отбеливание |
| 34 | 652617 | Зубная щетка Colgate Древние секреты. Забота о деснах |
| 35 | 653081 | Зубная щетка детская Colgate Миньоны для детей 2 + |
| 36 | 652621 | Зубная щетка детская Colgate Супермягкие щетинки для детей 5 + |
| 37 | 653080 | Зубная щетка Colgate Безопасное отбеливание |
| 38 | 671327 | Зубная щетка Colgate Макс блеск |
| 39 | 798677 | Зубная щетка Colgate SlimSoft шелковые нити |
| 40 | 798685 | Зубная щетка Colgate Slim Soft Charcoal с древесным углем |
| 41 | 641059 | Зубная щетка Colgate Шелковые нити с древесным углем (1 шт. + 1 шт.) |
| 42 | 641062 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax лечебные травы для десен (250 мл) |
| 43 | 652624 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax свежесть чая (250 мл) |
| 44 | 652625 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax Форте кора дуба и пихта (250 мл) |
| 45 | 652626 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax Древние секреты. Комплексная защита (250 мл) |
| 46 | 652622 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax освежающая мята (250 мл) |
| 47 | 873710 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Безопасное отбеливание (250 мл) |
| 48 | 652623 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax свежесть чая (500 мл) |
| 49 | 641064 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Plax Форте кора дуба и пихта (500 мл) |
| 50 | 891244 | Насадки для зубной щетки Colgate 360 |
| 51 | 891249 | Электрическая зубная щетка Colgate 360 Optic White |
| 52 | 891254 | Электрическая зубная щетка Colgate 360 Суперчистота всей полости рта |
| 53 | 891259 | Электрическая зубная щетка Colgate Супермягкие щетинки (Spiderman) |
| 54 | 652627 | Мыло твердое Palmolive Натурэль. Баланс и Мягкость с экстрактом ромашки и витамином Е (5 шт. х 70 г) |
| 55 | 671335 | Мыло твердое Palmolive Натурэль. Бодрящая свежесть с экстрактом зеленого чая и огурца (5 х 70 г) |
| 56 | 671339 | Мыло твердое Palmolive Натурэль Ощущение нежности с экстрактом лепестков роз и молочком (5 х 70 г) |
| 57 | 653048 | Мыло твердое Palmolive Натурэль Интенсивное увлажнение. Олива и Увлажняющее молочко (5 шт. х 70 г) |
| 58 | 653054 | Мыло жидкое Palmolive Натурэль Интенсивное увлажнение. Олива и Увлажняющее молочко (500 мл) |
| 59 | 653056 | Мыло жидкое Palmolive Натурэль. Питание – мед и увлажняющее молочко (500 мл) |
| 60 | 671364 | Мыло жидкое Palmolive Натурэль. Питание – мед и увлажняющее молочко (300 мл) |
| 61 | 653059 | Мыло жидкое Palmolive Нейтрализующее запах (300 мл) |
| 62 | 671373 | Гель для душа Palmolive Натурэль. Мягкая и свежая ежевика (250 мл) |
| 63 | 671372 | Гель для душа Palmolive Натурэль. Мягкий и сладкий персик (250 мл) |
| 64 | 653067 | Гель для душа Palmolive Натурэль Интенсивное увлажнение. Олива и Увлажняющее молочко (250 мл) |
| 65 | 653069 | Гель для душа Palmolive Натурэль. Черная орхидея и увлажняющее молочко (250 мл) |
| 66 | 653075 | Гель для душа Palmolive Роскошь масел. С экстрактами инжира, белой орхидеи и маслами (250 мл) |
| 67 | 653071 | Гель для душа Palmolive Роскошь масел. С маслом авокадо и экстрактом ириса (250 мл) |
| 68 | 641072 | Гель для душа Palmolive Роскошь масел. С маслом макадамии и экстрактом пиона (250 мл) |
| 69 | 641066 | Гель для душа Palmolive Гурмэ SPA Ежевичный мусс (250 мл) |
| 70 | 653063 | Гель для душа Palmolive Гурмэ СПА. Клубничный смузи (250 мл) |
| 71 | 653061 | Гель для душа Palmolive Гурмэ СПА. Кокосовое молочко (250 мл) |
| 72 | 671365 | Гель для душа Palmolive Гурмэ СПА. Шоколадная Вуаль (250 мл) |
| 73 | 641071 | Гель для душа Palmolive Men заряжающий лимонный взрыв 2 в 1 для тела и лица (250 мл) |
| 74 | 671367 | Гель для душа Palmolive Men 3 в 1. Арктический ветер (250 мл) |
| 75 | 671366 | Гель для душа Palmolive Men 2 в 1. Цитрусовый Заряд (250 мл) |
| 76 | 671371 | Гель для душа Palmolive Натурэль Интенсивное увлажнение. Олива и Увлажняющее молочко (750 мл) |
| 77 | 653077 | Гель для душа Palmolive Спорт для мужчин 3 в 1 (750 мл) |
| 78 | 798881 | Шампунь для волос Palmolive Men против перхоти и выпадения волос 2 в 1 (380 мл) |
| 79 | 1149892 | Ополаскиватель для полости рта Colgate Тройное действие (500 мл) |
| 80 | 798694 | Зубная нить Colgate Total фтор и мята (25 м) |
| 81 | 1149913 | Гель для душа Palmolive Мицеллярный уход с мицеллярной водой и экстрактом хлопка (250 мл) |
| 82 | 1149924 | Гель для душа Palmolive Мицеллярный уход с мицеллярной водой и экстрактом льна (250 мл) |
| 83 | 798848 | Шампунь для волос Palmolive С зеленым яблоком и цитрусовыми 2 в 1 (380 мл) |
| 84 | 798856 | Шампунь для волос Palmolive С маслом авокадо и гранатом 2 в 1 (380мл) |
| 85 | 641043 | Зубная паста Colgate Triple Action (100 мл) |
| 86 | 652601 | Зубная паста Colgate Бережное отбеливание (100 мл) |
| 87 | 1152783 | Зубная паста Colgate Elmex для детей с 1-го зуба и до 6 лет (50 мл) |
| 88 | 1152786 | Зубная паста Colgate Elmex защита от кариеса (75 мл) |
| 89 | 1152789 | Зубная паста Colgate Elmex Сенситив плюс (75 мл) |
| 90 | 1152792 | Зубная паста Colgate Elmex Junior для детей 6-12 лет (75 мл) |

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры.**
Участниками Рекламной игры могут быть:
граждане Республики Беларусь, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;
иностранные граждане, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь;
лица без гражданства, достигшие возраста 18 лет, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь и имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь.
К участию в Рекламной игре допускаются физические лица, заказывающие, приобретающие или использующие Игровые товары исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающие требованиям правил проведения Рекламной игры на условиях, предусмотренных в правилах проведения Рекламной игры.
Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. К участию не допускаются члены Комиссии.
Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в срок **с 8 октября 2019 г. по 11 ноября 2019 г. включительно**:
изучить правила проведения Рекламной игры, размещенные на сайте www.21vek.by.
Совершить покупку 1 (одного) или нескольких Игровых товаров на сайте интернет-магазина www.21vek.by, подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на сайте интернет-магазина www.21vek.by.
Заполнить форму интернет-заказа (далее – Форма) и указать данные:
фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется);
абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно);
адрес электронной почты (обязательно).
После выполнения вышеперечисленных условий покупатель становится Участником Рекламной игры и ему присваивается Игровой код.
Игровой код присваивается Участникам по дате и времени оплаты стоимости Игрового товара. Игровой код может принимать участие в Рекламной игре только 1 раз.
Для участия в Рекламной игре достаточно приобрести один Игровой товар.
Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки Игрового товара в отдельном заказе и выполнения остальных требований, необходимых для участия в Рекламной игре.
Фактом покупки (оплаты) товара в интернет-магазине **www.21vek.by** является факт выдачи продавцом кассового и/или товарного чека в момент передачи товара покупателю. Данные правила применяются и при осуществлении покупателем покупки с оплатой товаров «онлайн» при получении покупателем документа, подтверждающего оплату товара.

**8. Призовой фонд Рекламной игры.**
Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора.
Призовой фонд состоит из Призов, общее количество которых составляет 12 единиц (штук), общий размер призового фонда составляет 3 562,64 бел. руб.:

| № | Наименование приза | Название приза | Количество, шт. | Цена, бел. руб., 1 шт. | Общая сумма, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Смартфон Apple iPhone XR 64GB RED | «Приз 1» | 1 | 1 803,60 | 1 803,60 |
| | Денежные средства в размере 249,93 бел. руб. | | 1 | 249,93 | 249,93 |
| 2 | Робот-пылесос Philips FC8776/01 | «Приз 2» | 1 | 643,87 | 643,87 |
| | Денежные средства в размере 76,64 бел. руб. | | 1 | 76,64 | 76,64 |
| 3 | Зубная щетка электрическая Philips HX3212/03 | «Приз 3» | 10 | 78,86 | 788,60 |

Каждый Участник может выиграть только 1 (один) Приз в рамках Рекламной игры.

**9. Место, дата, время и порядок проведения Розыгрыша Призового фонда. Порядок определения победителей.**
Розыгрыш Призового фонда состоится 15 ноября 2019 года в 16.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.
Розыгрыш Призов проводится открыто с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.
К Розыгрышу допускаются участники, выполнившие условия, установленные в п. 7 настоящих Правил.
За ходом Розыгрыша призового фонда следит Комиссия.
Розыгрыш производится в следующем порядке.
К моменту Розыгрыша призов данные об Участниках Рекламной игры формируются в список Игровых кодов Участников (далее – Список) с указанием фамилии, имени, отчества (при наличии), абонентского номера мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате, адреса электронной почты, даты совершения оплаты заказа.
Для проведения Розыгрыша используется непрозрачная урна и карточки с Игровыми кодами в количестве равном количеству Участников Рекламной игры. Общее количество карточек помещается в непрозрачную урну, определение победителей идет путем случайного извлечения карточки с Игровым кодом Участника. Призы присваиваются в следующем порядке:
первые 10 (десять) извлеченных карточек Участников получают «Приз 3», каждый в количестве по 1 (одной) единице. Такие карточки далее в розыгрыше не участвуют.
Одиннадцатая извлеченная карточка Участника получает «Приз 2». Такая карточка далее в розыгрыше не участвует.
Двенадцатая извлеченная карточка Участника получает «Приз 1».
Итоги Розыгрыша фиксируются в протоколе Розыгрышей, подписанном присутствующими членами Комиссии.

**10. Порядок уведомления победителей о результатах Розыгрыша. Место, порядок и срок получения выигрышей.**
Победители извещаются о выигрыше не позднее 22 ноября 2019 года (включительно) посредством направления уведомления на адрес электронной почты, указанный при оформлении заказа на сайте www.21vek.by, а также по телефону (SMS сообщением и/или звонком), указанному при оформлении заказа на сайте www.21vek.by. В срок до 3 декабря 2019 года Победитель обязан предварительно согласовать с Организатором дату и место получения Приза по телефону + 375 29 3-021-021.
Победители могут получить Призы по 9 декабря 2019 года (включительно) при предъявлении паспорта (вида на жительство и т. п. документов, подтверждающих личность Победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) в пунктах выдачи заказов интернет-магазина www.21vek.by (по выбору Победителя):
город Минск: ул. Тростенецкая, 17, ул. Уманская 54 (ТЦ «Глобо»), ул. Кальварийская, 21;
город Брест: проспект Машерова, 96;
город Витебск: ул. Петруся Бровки, 20;
город Гомель: ул. Федосеенко, 4А;
город Гродно: ул. Свердлова, 17;
город Могилев: пр. Пушкинский, 43А;
город Барановичи: ул. Брестская, 226/4 (ТЦ «Легион»);
город Бобруйск: ул. Карла Маркса, 38;
город Борисов: ул. Строителей, 26;
город Жодино: ул. Гагарина, возле д. 20А;
город Лида: ул. Чапаева, 18, пом. 1;
город Мозырь: ул. Ленинская, 12;
город Молодечно: ул. Виленская, 13А;
город Новополоцк: ул. Еронько, 7А (ТЦ «Квартал 10»);
город Пинск: ул. Брестская, 72Д;
город Слуцк: ул. Ленина, 98Б/1;
город Солигорск: ул. Козлова, 46А.
Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы по оплате услуг связи. Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов.
В случае если Победитель не явился в срок, указанный в п. 10 настоящих правил, либо с Победителем не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных в регистрационной форме, либо Победитель написал заявление об отказе от Приза, либо Победитель не соответствует всем условиях участия в Рекламной игре, Приз остается в распоряжении Организатора.
Выплата денежного эквивалента призов не производится. Денежная компенсация за отказ от Приза по каким-либо причинам или в случае если Приз не будет востребован в течение выше установленного срока, не выдается.
В соответствии с гл. 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении «Приза 1» и «Приза 2» выступает налоговым агентом и удерживает сумму подоходного налога с дохода Победителя (из денежных средств Приза).

**11. Публикация Правил Рекламной игры, а также результатов проведения Рекламной игры. Сроки публикации.**
Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.
Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок не позднее 03 декабря 2019 года.
Дополнительную информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте **www.21vek.by** и по телефону: + 375 44 501-21-31.

**12. Прочие условия.**
Соглашаясь с правилами проведения Рекламной игры в целях проведения Рекламной игры, Участник подтверждает свое участие в Рекламной игре, а также дает согласие на передачу, хранение, использование, распространение Организатором следующих данных: фамилия, имя, отчество (при наличии), абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате, адрес электронной почты, дата совершения платежа.
Участники при заполнении персональных данных в Форме обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственность за ошибки, допущенные участником Рекламной игры и за достоверность данных, указанных Участником при заполнении Формы.
Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их фамилии, имена, отчества (при наличии), фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов.
В случае если Участник в период с 8 октября 2019 года по 14 ноября 2019 года (включительно) осуществил возврат товара надлежащего качества, при покупке которого были присвоены Игровые коды, такие Игровые коды Участника аннулируются. Об аннулировании Игрового кода в таком случае Участник не уведомляется.
Участники Рекламной игры, претендующие на получение Приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые для получения Приза документы, представляемые Организатором Рекламной игры.
Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с Призами, возникшие после передачи Победителю.
Претензии в отношении организации и проведения Рекламной игры Участники могут направлять по адресу: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 203, 2-й этаж.

*Свидетельство № 3647 о регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 1.10.2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь*

Добры знак

# ЧАС ВЯРТАННЯ СВЯТЫНЯЎ

## Сімвалам святкавання тысячагоддзя Брэста стала Біблія, якая зараз дэманструецца на выстаўцы



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

БОЛЬШ за дзесяць гадоў таму, калі ў Брэсце сталі праводзіцца навуковыя канферэнцыі па мясцовых кнігазборах, калі сюды паехалі навукоўцы па кніжнай справе з многіх краін, ніхто не мог сцвярджаць, што Біблія адносна хутка вернецца ў горад, дзе яна ўбачыла свет. Тады ўпершыню адкрыта загаварылі пра галоўны культурны сімвал XVI стагоддзя. А шырокую грамадскасць з гэтай тэмай пазнаёміла **Ала МЯСНЯНКІНА, тагачасны намеснік дырэктара абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага.** Пра Берасцейскую Біблію даведаліся кіраўнікі горада і вобласці, прадстаўнікі дзелавых колаў, мецэнаты.

Коратка нагадаю, што знакамітая кніга выйшла ў свет па загадзе і за сродкі берасцейскага старасты і канцлера Вялікага Княства Літоўскага Мікалая Радзівіла Чорнага. Ён запрасіў найлепшых на той час мастакоў Еўропы і перакладчыкаў. Кніга была выдадзена ў Брэсцкай друкарні ў 1563 годзе. Яе тыраж, як раней лічылі, складаў больш за 500 экзэмпляраў, цяперашнія даследчыкі дапускаюць, што было выпушчана ў два разы больш паасобнікаў.

Арыгіналы кнігі захаваліся ў розных краінах. Не было іх толькі ў нас. Праўда, у Брэсце некалькі гадоў таму з'явіўся фрагмент адной з кніг, а пра сапраўдны і поўны арыгінал даводзілася толькі марыць. І вось на святкаванні 1000-годдзя горада, як ужо шырока паведамлялася, Біблія вярнулася на сваю гістарычную радзіму. Адну з кніг выкупілі на еўрапейскім аўкцыёне прадстаўнікі бізнесу. Яе ў дар гораду перадаў Прэзідэнт краіны. Ён тады адзначыў, што, паводле меркавання прадкаў, горад, у якім выдавалася такая кніга, знаходзіцца пад асаблівай абаронай нябёсаў.

Літаральна праз некалькі дзён пасля святкавання бібліятэкі і музеі горада атрымалі таксама надзвычай каштоўныя падарункі — паасобнікі факсімільнага аднаўлення самага загадкавага, прыгожага і дарагога выдання ў айчыннай гісторыі — знакамітай Брэсцкай Біблііі. Работу выканала Нацыянальная бібліятэка Беларусі пры фінансавай падтрымцы кампаніі «Белнафтастрах». І вось у Брэсце прайшла прэзентацыя факсімільнага выдання. Чытачы цэнтральнай гарадской бібліятэкі, якія сабраліся ў чытальнай зале, маглі дакрануцца рукой да гэтай незвычайнай кнігі, а хто здолеў — нават падняць яе. Усё-такі выданне важыць 15 кілаграмаў, і не кожны адважыўся патрымаць гэты скарб. Але ж убачыць на свае вочы прыгожы фаліянт, дакладна такі, які некалі выходзіў з рук майстроў друкарскай справы на тэрыторыі цяперашняй крэпасці, было ўжо падзеяй.

Прадстаўляў брастаўчанам факсімільнае выданне намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, каардынатар і навуковы кіраўнік выдання, аўтар даследавання пра Брэсцкую Біблію Аляксандр СУША. Ён аспрэчыў некаторыя міфы, якія трывала прыжыліся вакол Біблііі. Адзін з самых распаўсюджаных, дарэчы, не раз агучаны падчас канферэнцый у Брэсце як навуковая версія, што пасля смерці Мікалая Радзівіла Чорнага яго сын Юрый, заўзяты каталік, загадаў спаліць пратэстанцкае выданне. Кнігі палілі ў двары Нясвіжскага палаца і на адной з плошчаў Вільні. Аляксандр Суша лічыць, што гаспадары гэтай кнігі, якая каштавала больш, чым цэлая вёска з сялянамі, не маглі пайсці на гэта. Наадварот, Біблію шанавалі, бераглі, часам бацькі перадавалі кнігу ў пасаг дочкам, і гэта быў багаты дар. А той факт, што ў свеце вядома больш за 130 экзэмпляраў кнігі, сведчыць аб яе добрай захаванасці.

З часам мы ўбачым і арыгінал Берасцейскай Біблііі ў музеі гісторыі горада. Пакуль яна захоўваецца ў металічным сейфе ў чаканні спецыяльнай вітрыны, у якой будуць падтрымлівацца неабходны тэмпературны рэжым і аптымальны ўзровень вільготнасці. Бо, як заўважыла дырэктар названага музея Святлана ТАМЧУК, мы павінны захаваць для нашчадкаў кнігу, якая ўжо перажыла амаль пяць стагоддзяў. І вядома, арыгінальная Біблія будзе за вітрынай, а факсіміле можна разгледзець, пагартаць, убачыць скураны пераплёт, металічныя засцежкі.

На прэзентацыі таксама гаварылі пра найвялікшы сэнс вяртання Брэсцкай Біблііі як акта гістарычнай справядлівасці. Сёння Біблію можна набыць і прачытаць на любой мове. Але ж гэтая раннастайнасць мела свае вытокі, а Берасцейская Біблія і ёсць адна з такіх крыніц. Бо яе перакладалі на польскую з арыгіналаў — іўрыта і грэчаскай, а не з перакладаў. А польская мова тады была мовай міждзяржаўных зносін, як цяпер, скажам, руская альбо англійская. І магчымасць такога выдання, гэтага, як цяпер сказалі б, праекта, гаворыць пра асаблівае значэнне і маштаб Берасця. Горад быў адным з лідараў эпохі Адраджэння, а затым і Рэфармацыі. І яшчэ сімвалічным бачыцца, што выдадзеная ў верасні 1563 года знакавая кніга, у верасні ў Брэст і вярнулася.

Ала Мяснянкіна, пра якую я згадвала на самым пачатку, гаварыла аднойчы на канферэнцыі: «Святыні вяртаюцца тады, калі прыходзіць час ім вяртацца. Спадзяёмся, што гэты час калі-небудзь прыйдзе. Брэсцкая Біблія вернецца ў Брэст. І гэта будзе азначаць пачатак новага жыцця для горада і яго насельнікаў».

Вельмі шкада, што Ала Міхайлаўна не дачакалася гэтай значнай і знакавай падзеі. Яна заўчасна памерла літаральна за месяц да юбілею горада. А на памянёнай прэзентацыі прагучала прапанова назваць адну з вуліц горада яе імем. Такім чынам будзе ацэнены ўклад бібліятэкара ў вяртанне на гістарычную радзіму адной з галоўных славутасцяў старажытнага Берасця і аднаго са скарбаў Беларусі. Можна спадзявацца, што так і будзе. І пра Біблію не толькі загавораць на ўроках гісторыі, але і прывядуць дзетак у бібліятэкі, музеі і пакажуць ім наш скарб. Як было ўжо ў гарадской бібліятэцы. Яе дырэктар Святлана ГАРАДЗЕЦКАЯ сказала, што вучні адной са школ, якія прыйшлі на экскурсію ў ліку першых, былі ў захапленні ад гэтай кнігі, нехта параўноўваў яе са сваімі падручнікамі, іншыя згадвалі, дзе яшчэ былі на экскурсіях і якія незвычайныя кнігі бачылі. Думаю, трэба вадзіць сюды дзяцей як мага часцей. Менавіта ім расказваць пра шматлікія прароцтвы, што вяртанне Біблііі паспрыяе росквіту горада, стане пачаткам яго новага жыцця.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Каля Манумента Дружбы новы ландшафтны дызайн

**Тэрыторыя вакол знакамітага помніка на граніцы трох краін набыла закончаны выгляд. Валанцёры БРСМ актыўна падключыліся да гэтай справы.**

На прыгранічччы Беларусі, Расіі і Украіны закладзена ландшафтная кампазіцыя, якая стала сапраўдным упрыгожаннем аднаўленага Манумента Дружбы. У работах прыняла ўдзел моладзь з Добрушскага раёна і Гомеля.

Аснову зялёнай зоны складаюць серабрыстыя вербы. **Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Ірына ДАЎГАЛА** адзначае, што самы высокі ўзровень кампазіцыі сімвалізуе старэйшае пакаленне, тых, хто стаяў ля вытокаў традыцый сумесных мерапрыемстваў каля манумента, якія пачалі праводзіць у далёкім 1962 годзе:

— Сучаснасць — кампактныя вытанчаныя вербы, а ярус спірэй сімвалізуе будучыя пакаленні. У трох узроўнях кампазіцыі ўвасоблена ідэя пераемнасці пакаленняў — тых, хто закладваў традыцыі правядзення сустрэч моладзі трох краін каля манумента, тых, хто гэтыя традыцыі павінен захаваць, і тых, каму іх перададуць і хто іх прымножыць. Таму мы вельмі спадзяёмся на тое, што хутка тут зноў будуць гучаць галасы і смех моладзі трох краін.

Добраўпарадкаванне тэрыторыі стала працягам праведзеных сёлета работ па рамонце памятнага знака на мяжы трох краін. Даручэнне давесці да ладу манумент, які пачаў разбурацца за апошнія гады, даў сёлета ў лютым Прэзідэнт Беларусі. На гэтыя работы было накіравана каля Br2 млн.

Над праектам маштабнага аднаўлення знакавага месца працавалі спецыялісты ААТ «Інстытут Гомельграмадзянпраект». Захаваны барэльефы гербаў трох краін, адрамантаваны пілоны, пакладзены новыя гранітныя прыступкі, з'явілася тратуарная плітка, выкладзеная ў выглядзе вышыванкі. Пры добраўпарадкаванні выкарыстоўваліся высакаякасныя матэрыялы.

Нагадаем, што Манумент Дружбы ў гэтым кутку прыгранічнай тэрыторыі быў пабудаваны ў 1975 годзе — у гонар 30-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Да 2014 года тут праводзіліся сустрэчы моладзі трох краін. Беларусь, Расія і Украіна штогод па чарзе прымалі гасцей. Тут праходзілі сустрэчы першых асоб трох дзяржаў, прыёмы дэлегацый, падпісанне дамоў пра супрацоўніцтва, творчыя і спартыўныя спаборніцтвы...

Пяць гадоў, як мерапрыемства ў трохбаковым фармаце на скрыжаванні трох граніц перастала праводзіцца. Фестываль апошнім часам праходзіць па чарзе ў прыгранічных гарадах Расіі ці Беларусі. І вось зноў з'явіўся шанц згуртаваць усходнеславянскія народы. Пра адраджэнне сустрэч каля манумента, які ў народзе па-ранейшаму называюць «Тры сястры», мараць усе простыя людзі, што жывуць, маючы сваякоў і сяброў па ўсе бакі трох граніц. Беларусы спадзяюцца, што фестываль «Славянскае адзінства» ўжо налета зможа вярнуцца на сваю родную пляцоўку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Цяжарным па кансультацыю — у... філармонію!

## Тут сярод іншага навучаць... візуалізаваць шчасце

**Адзінаму ў краіне праекту «Саткаць душу з нот» для цяжарных Віцебскай абласной філармоніі спаўняецца 10 гадоў. І зноў чакаюць жанчын на цыкл канцэртна-пазнавальных праграм для будучых мам.**

Навукоўцы даказалі, што класічная музыка выклікае ў цяжарнай станоўчыя эмоцыі. У яе ўзнікаюць пачуцці абароненасці і гармоніі. Шэдэўры класікі таксама ўздзейнічаюць на фарміраванне разумовых здольнасцяў і псіхікі будучага дзіцяці.

Праект распрацаваны лектарам-музыказнаўцам Таццянай Савіцкай і ажыццяўляецца пры партнёрскай падтрымцы ўстаноў аховы здароўя. Бясплатна кансультуюць проста ў філармоніі гінеколагі, дыетолагі, псіхолагі, эндакрынолагі і іншыя вузкія спецыялісты.

— Усе дзевяць гадоў мы рыхтавалі новыя праграмы, падбіралі карысныя ўзоры класічнай музыкі для будучых мам. Запрошаныя спецыялісты, якія наведвалі сустрэчы, дзяліліся каштоўнай інфармацыяй з нашымі слухачкамі і адказвалі на актуальныя пытанні: «Чаго чакаць, калі чакаеш дзіцяці?», «Што адбываецца з жанчынай падчас цяжарнасці?», «Ці ёсць жыццё пасля родаў?» і г. д., — расказвае аўтар праекта.

Юбілейны сезон для цяжарных стартуе 19 кастрычніка. Запрашаюць будучых мам і іх блізкіх на арганны канцэрт у вялікай зале філармоніі. Усіх дам чакае прыемны сюрпрыз ад спонсара праекта крамы для цяжарных, а таксама ёсць магчымасць выйграць падарунак.

У новым сезоне дамам прапануюць сярод іншага арт-тэрапію ў Музеі гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, будзе экскурсія ў Мастацкі музей, іншыя цікавыя мерапрыемствы.

— Цяжарнасць — не падстава сядзець дома! Наадварот, гэта — перыяд жыцця, калі будучая мама можа прысвяціць час сабе і нарэшце наведаць аб'екты арт-прасторы нашага горада, а ў дадатку атрымаць асалоду ад класічнай музыкі, — лічыць Таццяна Савіцкая.

У філармоніі прапануюць слухачкам і музычны пікнік, навучаць думаць аб добрым пад добрую музыку для візуалізацыі шчасця.



**У філармоніі праекты для цяжарных і мам з малымі дзецьмі.**

Будучыя мамы ўбачаць калекцыю адзення для цяжарных ад Народнага тэатра мод «Стыль». Кансультаваць па пытаннях моды будзе вядомы віцебскі стыліст Наталля Домкіна. Яна раскажа аб тым, як выглядаць стыльна без удару па кашальку.

У ліку іншых самых цікавых прапаноў — «Жывая бібліятэка». Цяжарныя пачуюць гісторыі віцебскіх мам аб самым складаным і цудоўным перыядзе іх жыцця. Мамы раскажуць аб сваім вопыце, а прыгожая музыка падорыць выдатны настрой.

Вельмі папулярны і цыкл праграм класічнай музыкі для дзяцей дашкольнага ўзросту і іх бацькоў «Казкі лялькі Лялі». Ён з'яўляецца працягам музычных сустрэч для мам. Цікаўная Ляля будзе знаёміць малых з новымі музычнымі інструментамі. Удзельнікі ансамбля «Талака» дадуць ёй ударныя інструменты ў самым шырокім дыяпазоне: бубен, бразготкі, тамбурын... Маленькія гледачы атрымаюць магчымасць пачуць тэмбры розных музычных інструментаў, пайграць на нескладаных шумавых і меладычных інструментах разам з музыкантамі, праспяваць. Музычнае выхаванне развівае ў малышоў здольнасць слухаць і чуць, адчуваць, рухацца, а галоўнае — думаць. Музыка адкрые для маленькага чалавечка свет новых вобразаў і ўражанняў.

Слова «філармонія» сёння не асацыюецца з нейкім сумным месцам, куды не захочацца зноў. Наадварот: прыходзяць і прыводзяць сваякоў і сяброў і да музыкі з вялікай літары прывучаюцца літаральна яшчэ да нараджэння.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

На сцэне

# ДОБРА, ШТО ТАТА НЕ БАЧЫЎ...

## Чым на форуме «ТэАРТ» гамбургскі тэатр «сарваў залу»

**КАЛІ таты доўга няма (гадоў так дваццаць, мама кажа, што ён у вайсковым паходзе, здзяйсняе геаічныя подзвігі), а сын раптам сустракае хлопца, які лічыць сваім бацькам таго ж чалавека, ці можа гэта скончыцца добра? Нават калі хлопчыкі выраслі і сустракаюцца ўжо дарослымі людзьмі? Ядома, можна абысціся і без бойкі на кулаках. Прыстойныя людзі заўсёды ж могуць паразмаўляць па-чалавечы.**

Ну-ну... Тэлемах і Тэлегон спрабуюць гэта зрабіць — і не могуць паразумецца. Не толькі таму, што ў іх розныя мамы. Для кожнага важны вобраз бацькі, імя якога грыміць па свеце, тым больш, што ён не абыхто, а легендарны цар Ітакі Адысей, герой Траянскай вайны, які знік на дваццаць гадоў, цяпер такога маглі б прылічыць да прапаўшых без вестак. Добра знайсці такога тату, пабачыць яго (жывым ці мёртвым), ды ў рэшце стаць яго спадкаемцам, пажадана адзіным... Як магла б выглядаць сустрэча двух сыноў Адысея, паказаў тэатр «Талія» з Гамбурга ў рамках міжнароднай праграмы форуму «ТэАРТ».

«Адысея» рэжысёра Анту Рамера Нунеса не мае дачынення да тэксту Гамера. І ў прынцыпе, да тэксту як такога. Бо, калі людзі спрачаюцца/свараццa, любыя словы — гэта найперш эмоцыі, магутны выкід энергіі, які трансфармуецца ў пачуццё. Яно зразумелае, нават калі цяжка разабраць, што гучыць. Ды і не трэба. Таму і з'явіўся вось такі варыянт, калі акцёры ў спектаклі кантактуюць паміж сабой з дапамогай выпадковага злучэння гукаў. То-бок на мове, якой не існуе, — яе прыдумалі толькі для гэтага спектакля. Для гледачоў, якія прывыклі лавіць словы, перад паказам у межах «ТэАРТа» зрабілі адмысловы пралогтлумачэнне, ды яшчэ з жартам: «Калі перад пачаткам спектаклю на сцэну выходзіць драматург, гэта нічым добрым не скончыцца...» А вось гэта залежала ад таго, хто на што разлічваў.

Класічная гамераўская «Адысея» тут ні пры чым — на сцэне няма ніякай згадкі пра антычнасць. На меркаваным партрэце таты, які ўмацоўваe на сцэне адзін з сыноў, — мужчына-зорка, герой сучасных мрояў. А самі Тэлемах і Тэлегон — такія вытанчаныя дэндзі ў адпрасаваных строях (але паколькі іх імёны не гучаць, то гэта могуць быць проста людзі, якія сустрэліся пры адпаведных абставінах). Яны прыходзяць аддаць даніну павагі чалавеку, якога не дачакаліся. Труна, што выязджае з глыбіні сцэны, схіляе да думкі, што, магчыма, ужо і не дачакаюцца. Таму ў аднаго ў руках — жалобны вяночак. У другога — кветка, але ж як прыгожа яна стаіць у вазе каля труны! Паглядзіце, хто больш любіць тату... І панеслася. Спачатку размова — на той самай мове, якую не зразумее ніхто ў свеце, але ўяўленне дапаможа пралічыць сутнасць таго, што могуць сказаць адзін аднаму зводныя браты, якія сустрэліся першы раз. Тым больш што ад слоўных высвятленняў адносін яны неўзабаве пераходзяць да дзеянняў.



Начальная цена продажи: 60 926,98 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка 6 092,70 бел. руб.

**Аукцион состоится 12 ноября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений: по 11.11.2019 до 12.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, и с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты проведения аукциона

**Продавец:** ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), УНП 101165625, г. Минск, ул. Московская, 14, тел./факс 8 (017) 309-15-15

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пять) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**, УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: **+ 375 222-72-41-14, + 375 29-624-26-25, + 375 29-550-09-56** и на сайте **ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже автотранспортной техники РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»

| № лота | Наименование | Начальная цена, бел. руб. (без учета НДС) | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | MAZ-MAN 543268, седельный тягач, кузов № Y3N54326850000726, 2006 г. в., цвет – зеленый | 11 488,97 | 2 297,79 |
| 2 | PPC-24, полуприцеп специальный цистерна, кузов № Y39PPC24090010004, 2009 г. в., цвет – оранжевый | 19 711,92 | 3 942,38 |
| 3 | MAZ 54326 8, седельный тягач, кузов № Y3N54326850000723, 2005 г. в., цвет – зеленый | 11 865,37 | 2 373,07 |
| 4 | ППЦ 30, полуприцеп специальный цистерна, кузов № Y39PPC30080010026, 2008 г. в., цвет – белый | 12 006,06 | 2 401,21 |
| 5 | MAZ-MAN 543268, седельный тягач, кузов № Y3N54326850000724, 2005 г. в., цвет – зеленый | 11 953,55 | 2 390,71 |
| 6 | PPC-30, полуприцеп специальный цистерна, кузов № Y39PPC30080010023, 2008 г. в., цвет – белый | 16 912,86 | 3 382,57 |

Местонахождение лотов: г. Фаниполь, ул. Заводская, 9

**Условия:** 1. Заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить стоимость Объекта(-ов) в течение 5 (пяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи. 3. Оплатить стоимость услуги и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 , составляет по лотам 1, 3, 4, 5 – 1000 бел. руб., по лотам 2,6 – 2000 бел. руб.

Аукцион состоится 06.11.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт», г. Фаниполь, ул. Заводская, 9, тел. 8 (017) 555-31-80. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 06.11.2019 (РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт», Лот №_). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Окончание приема заявлений 04.11.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Лотов: Гордей Александр Евгеньевич, тел. 8 (029) 393-30-08

☎ **Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

**Продавец** ОАО «Витебскоблавтотранс», 210001, Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11, тел. (0212) 68-73-41.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-75167, площадью 2440,7 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 18, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание АВИА-ТЭЧ № 219, составные части и принадлежности: крыльца, проезжая часть: участок 1, участок 2, участок 3, водопровод ввода, канализационная сеть. Многолетние насаждения: рябина, осина, клен, ели голубые, березы, всего – 30 шт. Передаточные устройства – распредустройство на 10 кВ, 1983 г. в., инв. № 3653, распредустройство на 0,4 кВ, 1986 г. в., инв. № 3654, трансформатор силовой масляный 400 кВА ТТ 400/10, 1983 г. в., инв. № 3652. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 221200000001001042, площадью 0,9429 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 18 с целевым назначением – земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Обременение: договор аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей № Дг10-252-А от 19.10.2018 сроком по 18.10.2021 г. (временное возмездное владение и пользование частью кровли здания АВИА-ТЭЧ № 219, площадью 121,0 кв. м).
**Нач. цена:** 258 388,80 бел. руб., в т. ч. НДС. **Задаток:** 25 838,88 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 05.11.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 07.10.2019 по 04.11.2019. **Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник) обязан: в течение 3 рабочих дней возместить затраты за организацию и проведение аукциона; в течение 3 рабочих дней возместить затраты на проведение независимой оценки в размере 987,12 бел. руб., в т. ч. НДС; подписать договор купли-продажи не позднее 10 календарных дней с момента объявления итогов аукциона; оплатить предмет торгов не позднее 10 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. **Задаток перечисляется на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Осмотр объекта осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Доп. информацию можно получить по тел: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 3463401.

## Уважаемые акционеры ОАО «Центр Моды», 12.11.2019 состоится ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 1, каб. 31. Время начала собрания – 11.00

Регистрация участников собрания будет проводиться 12 ноября 2019 года с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 1, 2-й этаж, каб. 31.

***Повестка дня:***
*1. О досрочном прекращении полномочий членов Наблюдательного совета ОАО «Центр Моды».*
*2. Об избрании членов Наблюдательного совета ОАО «Центр Моды».*
*Созыв внеочередного общего собрания акционеров осуществляется Наблюдательным советом ОАО «Центр Моды».*
*Установить дату начала и окончания приема предложений по выдвижению кандидатов в Наблюдательный совет ОАО «Центр Моды»: начало – 07.10.2019; окончание – 21.10.2019. Предложения направлять по месту нахождения Общества: г. Минск, пр-т Победителей, 1, к. 25б.*
*Не позднее чем за 10 дней до проведения внеочередного общего собрания акционеров проект решения собрания с приложением необходимых обоснований и пояснений будет выслан представителям государства и каждому акционеру, владеющему более 10 % акций Общества. Указанные материалы будут доступны для ознакомления иным акционерам (их представителям) по месту нахождения Общества с 01.11.2019 (в рабочие дни с 10.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00), а также в день проведения собрания до 14.00.*
*Для регистрации участник собрания предъявляет:*
*– акционер (физическое лицо) – документ, удостоверяющий личность;*
*– представитель акционера (физического лица) – доверенность от имени акционера и документ, удостоверяющий личность представителя;*
*– представитель акционера (юридического лица) – доверенность от имени юридического лица и документ, удостоверяющий личность;*
*– руководитель юридического лица, являющегося акционером общества, – документ, подтверждающий его полномочия на участие в собрании, и документ, удостоверяющий личность.*
*Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составлен по данным реестра акционеров на 07.10.2019.*

УНП 100649747

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | ОАО «Сморгоньагросервис», г. Сморгонь, ул. Тракторная, 64, тел. 8 015 92-45691 |

**Предмет аукциона:** объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кревский с/с, аг. Крево в следующем составе:

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Деревообрабатывающий цех** (здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель) | 1 564,4 кв. м | 443/С-13427 |
| **Цех по производству арболита** (здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель) | 648,7 кв. м | 443/С-13240 |
| **Контора цеха** (здание административно-хозяйственное) | 136 кв. м | 443/С-13424 |
| **Сооружение нижнего склада с ограждением** (сооружение специализированное лесохозяйственного назначения) | 758,1 кв. м | 443/С-15051 |
| **Навес** (сооружение специализированное складов, хранилищ) | 259,1 кв. м | 443/С-13429 |
| **Крановая эстакада с навесом** (сооружение специализированное обрабатывающей промышленности) | 496,2 кв. м | 443/С-13423 |
| **Сарай** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 14,9 кв. м | 443/С-13425 |
| **Сарай** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 13,7 кв. м | 443/С-13426 |
| **Асфальтобетонное покрытие** (сооружение специализированное лесохозяйственного назначения) | 7 335,8 кв. м | 443/С-15052 |
| **Электрические сети** (сооружение специализированное энергетики) | 310,1 м | 443/С-15053 |
| **Сведения о земельном участке:** пл. 1,6843 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для размещения и обслуживания деревообрабатывающего цеха | | |
| **Трансформаторная подстанция с ТМ-400** (здание специализированное энергетики) | 31,1 кв. м | 443/С-13358 |
| **Сведения о земельном участке:** пл. 0,0038 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания трансформаторной подстанции | | |
| **Сооружение пожарного водоема** (сооружение специализированное лесохозяйственного назначения) | 443/С-15054 | |
| **Сведения о земельном участке:** пл. 0,0089 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования обслуживания пожарного водоема (две емкости) | | |

Начальная цена с НДС 20 % – 119 000,00 белорусского рубля

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 08.08.2019 г.

**Аукцион состоится 21.10.2019 в 13.00** по адресу: **г. Сморгонь, ул. Тракторная, 70А, актовый зал. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.10.2019 до 17.00 по адресу:** г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703

**Тел: + 375 17 280-36-37; 8029-317-95-42, e-mail: auction@cpo.by**

**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых повторных торгов в форме аукциона по продаже комплекса недвижимого имущества ООО «Дорабел» (УНП 800000096, Минский район, Щомыслицкий с/с, район д. Озерцо, здание ЧП «Кормсис», комн. 14Б), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 18 октября 2019 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 4 октября 2019 года до 17.00 17 октября 2019 года.
***Место проведения торгов:*** Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «Дорабел» (УНП 800000096)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт». Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте http://bankrot.gov.by». Контактный телефон +375296847176

**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже комплекса недвижимого имущества (заборы и ворота) ООО «Дорабел» (УНП 800000096, Минский район, Щомыслицкий с/с, район д. Озерцо, здание ЧП «Кормсис», комн. 14Б.), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 5 ноября 2019 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 4 октября 2019 года до 17:00 4 ноября 2019 года.
***Место проведения торгов:*** Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «Дорабел» (УНП 800000096)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт». Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте http://bankrot.gov.by». Контактный телефон + 375296847176

Глабальнае пацяпленне

# ЦІ СТАНЕ ЗЯМЛЯ ЧЫРВОНАЙ ПЛАНЕТАЙ?

**Вучоныя заяўляюць, што сёлетні ліпень прызнаны самым спякотным месяцам за ўсю гісторыю назіранняў і, хутчэй за ўсё, 2019-ы ўвойдзе ў пяцёрку самых гарачых гадоў. Перыяд за 2015—2019 гады (зноў жа рэкордны па высокіх тэмпературах) сведчыць, што глабальнага пацяплення не пазбегнуць. Сярэдняя тэмпература ўжо паднялася на 1,2 градуса і будзе працягваць расці. Вучоныя ўсяго свету папярэджваюць аб пагрозах жыццядзейнасці чалавека і яго здароўю. Пацяпленне адаб'ецца на водазабеспячэнні, харчовай бяспецы, эканоміцы. Геафізічныя катастрофы, звязаныя са змяненнем клімату, за перыяд з 1998 года ўжо забралі жыцці аднаго мільёна 300 тысяч чалавек. Эксперты лічаць, што прамыя эканамічныя страты ў выніку прыродных катаклізмаў ацэнены амаль у тры трыльёны долараў. І гэта толькі пачатак крызісу.**

## МЫ ПАЧЫНАЕМ БОЙ

Усе гэтыя праблемы, а таксама шляхі іх вырашэння нядаўна разглядаліся на Саміце па клімаце, што прайшоў у Нью-Ёрку. У ім прымалі ўдзел сусветныя лідары, члены ўрадаў, прадстаўнікі бізнесу і грамадства. Галоўная мэта саміту — узгадніць план дзеянняў па выкананні Парыжскага пагаднення, прынятага ў 2015 годзе. У гэтым дакуменце дзяржавы (а дакумент ратыфікавалі 186 краін, у тым ліку і Беларусь) дамаўляліся аб тым, што будуць рабіць усё магчымае для таго, каб утрымліваць пацяпленне ў межах двух градусаў Цэльсія ў параўнанні з паказальнікамі даіндустрыяльнай эпохі. Цяпер размова вядзецца пра тое, што патрэбна і магчыма скарачаць рост тэмператур на 1,5 градуса.

— Змены клімату — галоўная бітва нашага жыцця, якую мы можам і павінны выйграць, — заўважыла падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **Пастаянны каардынатар ААН у Рэспубліцы Беларусь Іаанна КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ.** — У нас ёсць неабходныя інструменты, тэхналогіі, веды. А чаго не хапае, так гэта палітычных рашэнняў. У першую чаргу трэба спыніць будаўніцтва новых вугальных электрастанцый і зрабіць гэта да 2020 года. Нам патрэбна зялёная, а не шэрая эканоміка. Але многія краіны, у тым ліку і Еўрапейскага саюза, да гэтага часа фінансуюць станцыі, якія працуюць на вугалі. Важным з'яўляецца інвеставанне ў чыстую энергетыку і энергаэфектыўнасць. Наступны прыярытэт — мадэрнізацыя жылых дамоў (і наогул усяго асяроддзя чалавека: офісаў, школ, садкоў і іншага). Будынкі павінны быць энергаэфектыўныя. Трэба знізіць утрыманне вугляроду ў працэсе вытворчасці цэменту, пластыку і сталі; перайсці на электратранспарт, больш выкарыстоўваць грамадскі, а не індывідуальны транспарт.

Найбольшы ўплыў на змены клімату аказваюць гарады. Па даных ААН—Хабітат, гарады спажываюць 78 працэнтаў сусветнай энергіі і даюць каля 60 працэнтаў выкідаў парніковых газаў. Пры гэтым яны займаюць менш за два працэнты паверхні зямлі. Становішча пагаршаецца яшчэ і таму, што скарачаецца колькасць зялёных зон. Таму сёння чалавецтву трэба перагледзець падыходы да выкарыстання энергетычных, зямельных рэсурсаў, мяняць інфраструктуру. Гарады ва ўсім свеце пачалі прымаць меры па скарачэнні выкідаў парніковых газаў і праводзіць палітыку заахвочвання выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі. Шмат залежыць і ад паводзін насельніцтва. Так, гараджане, якія з аўтамабіляў пересаджваюцца на ровары, такім чынам садзейнічаюць скарачэнню забруджвання паветра.

На колькасць парніковых газаў уплывае нават тое, якую ежу мы ўжываем. Адна справа, калі мы выбіраем раслінную, другая — мяса, пры вытворчасці якога больш выкід парніковых газаў.

Як заўважыла Іаанна Казана-Вішнявецкі, глабальныя фінансавыя выдаткі, накіраваныя на барацьбу з кліматычнымі зменамі, выраслі ў апошнія чатыры гады на 17 працэнтаў. Гэта станоўчая тэндэнцыя, але рэсурсаў для вырашэння праблемы пакуль яшчэ не хапае.




## ЧАС НЕ ЦЕРПІЦЬ

**Эксперт ААН/ЭС у галіне змен клімату Аляксандр ГРАБЯНЬКОЎ** прадэманстраваў графікі і карты, на якіх некаторыя краіны пафарбаваны ў чырвоны колер, што сведчыць пра небяспеку. Прагнозы пра тое, што чакае нашу планету, калі чалавецтва не будзе рабіць ніякіх захадаў, даволі песімістычныя. Так, да 2100 года сярэдняя глабальная тэмпература можа вырасці на пяць працэнтаў вышэй за аптымальны клімат. Напрыклад, для Беларусі гэта азначае, што знікнуць яловыя лясы і мы станем стэпавай краінай.

Апошнія 20 гадоў у Беларусі былі самымі спякотнымі за 130 гадоў назірання. У выніку змен клімату, з аднаго боку, павялічыўся цёплы і вегетацыйны перыяд і сфарміравалася новая аграрнакліматычная зона, але ўраджай асноўных відаў культур стаў менш стабільны. Зніжэнне ўзроўню грунтовых водаў, пажары, ураганы, размнажэнне шкоднікаў і развіццё хвароб негатыўна адбіваюцца на лясной гаспадарцы. Калі тэмпературы будуць расці, гэта можа паўплываць на якасць пітной вады і на здароўе людзей.

— Часу зусім няма. Калі прымалася Парыжскае пагадненне, меркавалася, што ўсе краіны пачнуць дастаткова хутка зніжаць выкіды на 1,5 працэнта ў год. Мы не тое што не паспяваем рэалізаваць планы, а наадварот. Нягледзячы на нашы амбіцыі, усе краіны павялічваюць выкіды (за апошнія 10 гадоў яны раслі з хуткасцю 3,5 працэнта ў год). Колькасць жыхароў на планеце Зямля працягвае павялічвацца. А калі паглядзець на графікі з глабальнай колькасцю насельніцтва і глабальнымі выкідамі, можна ўбачыць, што яны амаль ідэнтычныя, — гаворыць прадстаўнік ААН.

— Калі разлічвалася, што скарачэнне выкідаў на 1,5 працэнта ў год — рэальная лічба, чаму яна да гэтага часу недасягальная? — спыталі журналісты.

— Планета не можа зрабіць такі хуткі крок. Краіны яшчэ не гатовы, няма інфраструктуры. Узяць тую ж Беларусь, яна не зможа павярнуцца хутчэй, чым дазволіць эканоміка. Так і з іншымі краінамі. Яшчэ не працуюць механізмы, якія прапануе Парыжскае пагадненне. Сярод іх — узаемнае фінансаванне, абмен вугляроднымі квотамі, дапамога краінам, якія развіваюцца, каб яны скарачалі выкіды. У той жа час страты ад невыканання нашых абавязкаў перад прыродай могуць з кожным годам расці. Вялікія выдаткі звязаныя з пераадоленнем наступстваў прыродных катастроф. Калі сітуацыя пагоршыцца, каля паўмільярда чалавек вымушаны будуць перасяляцца, а гэта таксама патрабуе сродкаў. Але справа не толькі ў грошах, важна мяняць палітыку, выкарыстоўваць матывуючыя інструменты, якія дазволілі б бізнесу ісці па правільным кірунку.

Экспертаў засмучае, што Парыжскае пагадненне арыентуецца на індывідуальныя абавязацельствы краін, не ўстанаўлівае ніякіх забарон ці пакаранняў для «вытворцаў выкідаў», што, натуральна, не матывуе прадпрыемствы на змены ў «зялёны» бок. Але Парыжскае пагадненне ўводзіць механізмы, якія дазваляюць бізнесу справіцца з задачай па скарачэнні выкідаў. Дарэчы, у Германіі ўрад ужо сёння спрабуе іх выкарыстоўваць. Тут будуць штрафаваць за выкіды, у выніку чаго рабіць бізнес па старых тэхналогіях стане дорага. У той жа час пры пераходзе на новыя тэхналогіі прадпрыемствы змогуць атрымліваць пэўныя фінансавыя выгады, напрыклад гранты і льготы.

Бясспрэчна, і Беларусі трэба сачыць за тым, якія экалагічныя рашэнні прымаюць іншыя краіны. І не толькі для таго, каб змагацца з пацяпленнем клімату, а каб быць канкурэнтаздольнай краінай. Мы не выжывем у новых эканамічных умовах, калі не будзем развіваць вугляроданейтральныя і энергаэфектыўныя тэхналогіі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

**Інфаграфіка Аляксандра АСІПЕНКІ.**

## ЭЛЕКТРОБУСЫ СУПРАЦЬ ПАЦЯПЛЕННЯ

**Рэспубліка Беларусь стала краінай Парыжскага пагаднення 20 верасня 2016 года — першай з усіх краін СНД і 30-й у свеце — і за гэты час паспела зрабіць вельмі шмат для пераходу да зялёнай эканомікі. Так, яна выконвае свае абавязацельствы па скарачэнні выкідаў парніковых газаў на 28 працэнтаў і гатова заявіць пра больш амбіцыйныя планы — да 2030 года знізіць выкіды на 33 працэнты ў параўнанні з 1990 годам.**

Для выканання абавязацельстваў па Парыжскім пагадненні ўрадам Беларусі зацверджаны план мерапрыемстваў. Адно з рашэнняў, якое спрыяе набліжэнню краіны да вугляроднай нейтральнасці, — пераход на электрычны транспарт. Прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў высокага ўзроўню, якія рэгулююць гэтую сферу.

Як паведамілі **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ,** у нашай краіне распрацоўваецца комплексная праграма па пераходзе ўсяго грамадскага транспарту ў буйных гарадах на электрычную цягу. У Беларусі вырабляюцца ўсе віды пасажырскага электратранспарту, ёсць уласныя інавацыйныя распрацоўкі электрамабіляў. На сёння эксплуатуецца 83 адзінкі электробусаў вытворчасці кампаніі «Белкамунмаш». Цяпер кампанія займаецца распрацоўкай новага электробуса, які будзе адпавядаць патрабаванням Еўрасаюза і можа экспартавацца ў краіны, што ўваходзяць у яго склад.

Неабходна яшчэ шмат зрабіць для развіцця інфраструктуры. Тут не абысціся без каардынацыі намаганняў краін па фарміраванні адзіных падыходаў да абсталявання зарадных станцый, станцый тэхнічнага абслугоўвання. Тады Беларусь магла б стаць сапраўдным калідорам для электратранспарту, які перамяшчаецца з Заходняй Еўропы на ўсход або з поўначы на поўдзень.

Беларусь імкнецца стаць нізкавугляроднай краінай да 2050 года. У ліку канкрэтных мер на шляху да гэтай мэты — больш шырокае выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі, будаўніцтва энергаэфектыўнага жылля, укараненне ў эканоміку нізкавугляродных і безвугляродных тэхналогій, увядзенне вугляроднага падатку і стварэнне нацыянальнага вугляроднага рынку. Паралельна краіна працуе над зніжэннем выкідаў парніковых газаў і павышэннем іх паглынання прыроднымі экасістэмамі.

# ПРАКЛЁН «КРАІНЫ ІНКАЎ»

## Што адбываецца ў Перу?



**Гэтыя дні дакладна ўвойдуць у гісторыю старажытнага Перу. У пачатку тыдня прэзідэнт лацінаамерыканскай дзяржавы Марцін Віскара абвясціў аб роспуску Кангрэса (аднапалатнага парламента) і правядзенні датэрміновых выбараў, перадалі сусветныя інфармагенцтвы. Гэта адбылося пасля таго, як дэпутаты вылучылі ў склад Канстытуцыйнага трыбунала людзей, якія, на думку кіраўніка краіны, могуць быць уцягнутыя ў карупцыйныя схемы. «Мы зрабілі ўсё, што ў нашых сілах, каб зладжана ісці наперад разам з парламентам. Аднак відавочна, што перашкоды не канчаюцца, калі гаворка заходзіць аб абароне карупцыі, таму па гэтым пытанні пагадненне немагчымае», — заявіў Віскара. Аднак неўзабаве парламент абвясціў, што сам адхіляе прэзідэнта на год з-за яго "маральнай няздольнасці" кіраваць краінай, паведаміла The New York Times. Чаму ліхаманіць Перу?**

### ПРЫНАДА ДЛЯ ІНШАПЛАНЕЦЯН

Аж да сярэдзіны XVI стагоддзя тэрыторыя Перу была цэнтрам імперыі інкаў — аднаго з найбольш высокаразвітых індзейскіх плямёнаў, якое здолела ўладкавацца ва ўмовах суровага высакагорнага клімату. Цяпер гэта трэцяя па плошчы (пасля Бразіліі і Аргенціны) краіна Паўднёвай Амерыкі. У сучасным Перу насельніцтва ўмоўна падзяляецца на тры часткі па колькасці ландшафтных тэрыторый у краіне. Найбольш заселеныя — коста (узбярэжжа Ціхага акіяна) і сьера (прылеглыя горныя даліны), менш за ўсё — сельва Амазонкі на ўсходзе.

Перу — аграрная дзяржава з высокаразвітой горназдабыўной і апрацоўчай прамысловасцю. Каля чвэрці валавога ўнутранага прадукту краіны (звыш 220 мільярдаў долараў) прыпадае на здабычу і перапрацоўку рэсурсаў: металаў, нафты, прыроднага газу. Перу — буйны экспарцёр. Летась краіна заўважна нарасціла аб'ёмы паставак на знешнія рынкі. «У 2018 годзе перуанскі экспарт склаў 47 мільярдаў 702 мільёны долараў, паказваючы рост апошніх тры гады, і перавысіў гістарычны рэкорд 2012-га (46 мільярдаў 359 мільёнаў долараў)», — паведаміла міністэрства знешняга гандлю і турызму Перу. Найбольш істотны рост паказаў аграсектар (15 %), хімічная (12 %) і металургічная (12 %) галіны, прадукцыя рыбалоўства (26 %). Перу стала другой краінай у свеце (пасля Мексікі) па аб'ёме экспарту авакада, які дасягнуў 793 мільёнаў долараў. Краіна таксама нарасціла пастаўкі прыроднага газу (на 35 %), нафты і яе вытворных (на 16 %).

Сельская гаспадарка фарміруе каля 10 працэнтаў ВУП, а пераважная доля эканомікі (у рэчышчы сучасных трэндаў) грунтуецца на сферы паслуг. Тут перш за ўсё варта згадаць турызм. Многія здзівяцца, але самая наведваемая краіна Паўднёвай Амерыкі зусім не Аргенціна або Бразілія, а Перу. Рэшткі старажытных цывілізацый (адна крэпасць Мачу-Пікчу чаго вартая!) і знакамітая на ўвесь свет кухня, маляўнічыя горы і амазонская сельва, цудоўныя пляжы і бяспека прыцягваюць сюды мільёны людзей. У «краіне інкаў» рэалізуюцца і ўвогуле ўнікальныя праекты — напрыклад, летась была праведзена серыя канферэнцый па ўзгадненні будаўніцтва... іншапланетнага пасольства. Не ведаю як прыцягненне касмічных цывілізацый, а пашырэнню турыстычнага патоку гэтая мера дакладна паспрыяе.

Як бачым, у Перу ёсць усе падставы для дынамічнага росту. Не здарма адной з асноўных задач у сваёй прамове парламенту пасля ўступлення на пасаду 24 сакавіка мінулага года прэзідэнт Марцін Віскара назваў эканамічнае развіццё рэспублікі. «Мы ведаем, што для росту нашай краіне неабходна быць канкурэнтаздольнай і стварэць рабочыя месцы для ўсіх перуанцаў, таму мы будзем стымуляваць прыватную ініцыятыву і падтрымліваць малы і сярэдні бізнес», — адзначыў палітык.

### ХАБАР НА 788 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Аднак галоўнай задачай у тым жа выступленні перад Кангрэсам Віскара назваў барацьбу з карупцыяй. «Мы будзем вельмі цвёрда супрацьстаяць незаконным дзеянням, хто б іх ні здзяйсняў і чаго б гэта нам ні каштавала», — сказаў прэзідэнт фактычна ўсёй краіне, паколькі яго зварот перадаваў у прамым эфіры тэлеканал TV Peru. Інжынер па адукацыі, Віскара прыйшоў у палітыку толькі ў 2010 годзе пасля ўдзелу ў пратэстах супраць нераўнацэннага фінансавання рэгіёнаў і іх падаткаабкладання. Падчас гэтых маніфестацый ён прадэманстраваў сваё ўменне дамаўляцца і прымірацць варагуючыя бакі. Неўзабаве Віскара быў абраны губернатарам рэгіёна Макегуа. У 2016 годзе Педра Пабла Кучынскі, які быў тады кандыдатам на пасаду прэзідэнта, паклікаў яго ў сваю каманду. Так Віскара стаў спачатку віцэ-прэзідэнтам, а летась — прэзідэнтам Перу.

Ён нездарма вызначыў барацьбу з карупцыяй у якасці галоўнага прыярытэту. Гэтая з'ява насамрэч стала праклёнам «краіны інкаў» і тормазам развіцця перспектыўнай ва ўсіх аспектах дзяржавы. Менавіта цяпер у самым разгары найбуйнейшы карупцыйна-палітычны скандал за апошнія гады. Галоўныя фігуранты — пяць (!) апошніх прэзідэнтаў краіны. Чыноўнікаў абвінавачваюць у атрыманні хабараў ад будаўнічай кампаніі Odebrecht.

Тры з экс-прэзідэнтаў пад следствам, а Альберта Фухіморы ўжо адбывае 25-гадовы турэмны тэрмін у сувязі з карупцыяй і парушэннем правоў чалавека. Ён правіў Перу 10 гадоў — з 1990-га да 2000-га. На думку прэсы, менавіта ён кіраваў цёмнымі схемамі нават пасля сыходу з пасады праз сваю дачку — Кейка Фухіморы. Яна, дарэчы, таксама цяпер пад арыштам, чакае суда.

Папярэднік Віскара Педра Пабла Кучынскі ў пачатку 2000-х двойчы займаў пасаду міністра фінансаў і эканомікі Перу, пасля чаго стаў прэм'ер-міністрам. У 2016 годзе яго абралі прэзідэнтам краіны. У канцы 2017-га Odebrecht у рамках урэгулявання міжнароднага карупцыйнага скандалу прызналася, што заплаціла звязаным з Кучынскі кампаніям First Capital і Westfield Capital амаль пяць мільёнаў долараў за «кансультацыйныя паслугі». Па версіі абвінавачвання, прэзідэнт Перу выдаткаваў гэтыя грошы на асабістыя патрэбы, у тым ліку на куплю асабняка ў элітным раёне Лімы. З-за скандалу з Odebrecht Кучынскі падаў у адстаўку ў сакавіку мінулага года.

Яшчэ адзін экс-прэзідэнт, Алан Гарсія, які таксама праходзіў падазраваным па справе Odebrecht, прасіў прытулак у пасольстве Уругвая ў Ліме, але атрымаў адмову. Сёлета ў красавіку ён застрэліўся, калі яго прыйшлі арыштоўваць па абвінавачванні ў карупцыі, паведаміла выданне El Tiempo. Праўда, у сваёй перадсмяротнай запісцы колішні прэзідэнт заявіў аб сваёй невінаватасці. «Не было ніякіх рахункаў, ніякіх хабараў, ніякага багацця. Іншыя прадаюцца — я не», — напісаў Гарсія.



Odebrecht — будаўнічы гігант з Бразіліі, які на піку свайго поспеху ў 2010 годзе меў больш за 180 тысяч супрацоўнікаў у 21 краіне свету. Кампанія ўдзельнічала ў буйных інфраструктурных праектах у Паўднёвай Амерыцы, у тым ліку будавала метро ў Каракасе і аб'екты для чэмпіяната свету па футболе 2014-га і Алімпійскіх гульняў 2016 года ў Бразіліі. У 2015-м у рамках расследавання справы аб карупцыі бразільскія праваахоўныя органы арыштавалі кіраўніка Odebrecht Марсела Одэбрэхта і шэраг топ-менеджараў кампаніі. Яны заключылі здзелку са следствам і далі прызнальныя паказанні.

Было ўстаноўлена, што Odebrecht з 2001-га да 2016-га заплаціла ў якасці хабару 788 мільёнаў долараў у 12 краінах Лацінскай Амерыкі. Атрымальнікамі грошай выступалі палітычныя дзеячы, якія дапамагалі кампаніі з выгаднымі кантрактамі. Самым высокапастаўленым палітыкам, асуджаным за хабар ад Odebrecht, стаў віцэ-прэзідэнт Эквадора Хорхе Глас, які ў снежні 2017 года быў прысуджаны да шасці гадоў турмы па абвінавачванні ў атрыманні 13,5 мільёна долараў. У Перу, згодна з паказаннямі кіраўніцтва, кампанія заплаціла хабараў на 29 мільёнаў долараў.

### АПОШНЯЯ КРОПЛЯ

Стаўшы прэзідэнтам краіны, Марцін Віскара імкнуўся правесці шэраг антыкарупцыйных рэформаў. Але парламент напросту не прымаў яго ініцыятывы. Увогуле канфлікт дзвюх галін улады ў Перу пачаўся яшчэ ў 2016 годзе, калі прэзідэнцкія выбары выйграў Педра Кучынскі. Яму ўдалося абысці лідара партыі «Народная сіла» (НС) Кейка Фухіморы. Пры гэтым НС мае самую вялікую фракцыю ў парламенце. «Вайна» з Кучынскі спачатку складвалася на карысць прыхільнікаў Фухіморы. Аднак віцэ-прэзідэнт Віскара, стаўшы кіраўніком дзяржавы, працягнуў канфрантацыю з парламентам. У кастрычніку 2018 года была арыштаваная яго галоўны апанент Кейка Фухіморы. Але ўплыў на сваю фракцыю ў парламенце ў яе па-ранейшаму застаўся. У цяжкай барацьбе з Кангрэсам Віскара дамогся вяртання на нары Фухіморы-старэйшага. З прычыны сталага ўзросту (ён 1938 года нараджэння) экс-прэзідэнт быў памілаваны ў 2017-м. Альберта Фухіморы зноў вярнуўся ў турму ў мінулым месяцы. Мабыць, гэта акалічнасць прымусіла «Народную сілу» і Кейка Фухіморы фарсіраваць канфлікт.

Кангрэс неаднаразова блакаваў розныя ініцыятывы прэзідэнта Віскары, у тым ліку і прапанову аб датэрміновых выбарах: як прэзідэнцкіх, так і парламенцкіх. Сітуацыя відавочна напалялася. Апошняй кропляй, якая прывяла да цяперашняму крызісу, стала жаданне Кангрэса практычна цалкам замяніць склад Канстытуцыйнага трыбунала краіны. «З неверагоднай хуткасцю яны прапанавалі кандыдатаў за паўгадзіны, нават не праверыўшы, ці няма ў іх сувязяў з тымі, каго падазраюць у карупцыі»,— сказаў прэзідэнт Віскара. Кандыдатаў вылучылі ў пятніцу, а ў панядзелак Кангрэс павінен быў зацвердзіць іх на пасадах. Прэзідэнт папярэджваў дэпутатаў, што абвесціць аб роспуску Кангрэса, калі тыя пачнуць прызначэнні суддзяў да таго, як разгледзяць пытанне аб даверы ўраду. Але яны не прыслухаліся да яго, і ўсё ж паспелі прызначыць аднаго з членаў трыбунала.

Пазней агенцтва Andina паведаміла, што Віскара пасля роспуску парламента прызначыў новага кіраўніка савета міністраў. Па інфармацыі выдання, месца Сальвадора дэль Солара заняў міністр юстыцыі Вісэнтэ Себальяс. Пасля абвяшчэння аб роспуску дэпутаты засталіся на сваіх месцах да глыбокай ночы і прагаласавалі за адхіленне ад улады Марціна Віскары. Выконваючым абавязкі кіраўніка дзяржавы яны прызначылі віцэ-прэзідэнта Мерседэс Араас. «Я з мужнасцю прымаю гэта (прызначэнне. — **Рэд.**), — заўважыла Араас. — Гэта адно з самых складаных рашэнняў у маім жыцці». Аднак пасля яна заявіла, што сыходзіць у адстаўку, і заклікала правесці ў найбліжэйшы час усеагульныя выбары. Згодна з заявай віцэ-прэзідэнта, яе адстаўка азначае, што яна таксама адмаўляецца ад даверанай ёй пасады выконваючага абавязкі прэзідэнта.

### ЧАС ВЫРАШАЦЬ

Як растлумачыў агенцтву Associated Press прафесар па канстытуцыйным праве Пантыфікальнага каталіцкага ўніверсітэта Перу Сесар Ланда, любое рашэнне Кангрэса пасля заявы прэзідэнта аб яго роспуску не мае сілы. Дырэктар Цэнтра іберааамерыканскіх даследаванняў Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта Віктар Хейфец называе цяперашняе абвастрэнне супрацьстаяння заканамерным. «Можна сказаць, што да гэтага ўсё і ішло», — сказаў ng.ru эксперт. — У Віскары не было варыянтаў».

У падтрымку прэзідэнта ўжо выказаліся сілавыя структуры. Перуанскае выданне La Republica апублікавала заяву міністэрства абароны, праз якое ваенныя ўлады пацвердзілі, што аб'яднанае камандаванне ўзброеных сіл, ваенна-марскога флоту і ваеннапаветраных сіл краіны падтрымліваюць кіраўніка дзяржавы і яго рашэнне распусціць Кангрэс. У заяве таксама падкрэсліваецца, што ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, прэзідэнт адначасова з'яўляецца галоўнакамандуючым узброеных сіл і Нацыянальнай паліцыі Перу.

Падтрымалі Марціна Віскару і жыхары краіны. Нягледзячы на позні час, пасля выступлення прэзідэнта сотні людзей сабраліся каля будынка Кангрэса, выкрыкваючы лозунг: «Прэч адсюль, прадажныя палітыкі!» Некаторыя пратэстоўцы нават паспрабавалі ўварвацца ў парламент, каб выгнаць дэпутатаў сілай. «Тое, што адбылося, — гэта канстытуцыйны роспуск кангрэса з захаваннем усіх законных патрабаванняў», — заявіла РІА «Навіны» экс-кангрэсмен ад левай партыі «Новае Перу» Таніа Парыона.

Паводле апытання, праведзенага Інстытутам перуанскіх даследаванняў і апублікаваным напрыканцы верасня, дзейнасць Кангрэса не ўхваляюць 87 працэнтаў апытаных. «Закрыццё (парламента. — **Рэд.**) выглядае дэмакратычным рашэннем праблемы, ад якой краіна пакутуе ўжо тры гады, — заявіў Віскара. — Дазвольце ўжо людзям вырашыць, хто мае рацыю». Правядзенне датэрміновых парламенцкіх выбараў прызначана прэзідэнтам Перу на 26 студзеня 2020-га. Магчыма, «краіне інкаў» усё ж удасца перадолець шматгадовы праклён.

**Захар БУРАК.**

